Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 КРАСАВІКА 2014 г. АЎТОРАК № 74 (27684) Кошт 1800 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

СТАЦЬ ЛІДАРАМ «ЛІЧБАВАЙ ЭКАНОМІКІ»

Удзельнікам XXI Міжнароднага спецыялізаванага форуму па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях «TIBO-2014» і XVIII Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «СМІ ў Беларусі».

Дарагія сябры!

Вітаю гасцей і ўдзельнікаў форуму «TIBO-2014» і выстаўкі «СМІ ў Беларусі».

За апошнія некалькі дзесяцігоддзяў інфармацыйныя тэхналогіі цалкам змянілі аблічча сучаснага свету, адкрыўшы перад чалавецтвам нябачаныя раней магчымасці. Нездарма цяперашні этап развіцця цывілізацыі так і называецца — «інфармацыйнае грамадства».

Беларусь вызначыла амбіцыйную задачу ў бліжэйшыя гады стаць лідарам ва Усходняй Еўропе ў развіцці «лічбавай эканомікі».

Асновай нашага поспеху, упэўнены, будуць дасягненні таленавітых беларускіх вучоных, інжынераў, праграмістаў і прадпрымальнікаў, прадстаўленыя на пляцоўцы «TIBO-2014».

Сімвалічна, што форум «TIBO-2014» і выстаўка «СМІ ў Беларусі» праходзяць разам. Па-за інтэрнэтам традыцыйныя СМІ сёння ўжо немагчыма ўявіць. Відавочна, што актыўнае прасоўванне інавацыйных тэхналогій у айчынную медыясферу — фундамент яе поспеху.

Ад усёй душы зычу ўдзельнікам і гасцям гэтых мерапрыемстваў хутчэйшага дасягнення намечаных мэт і плённай працы на карысць беларускага народа.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Сёння Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка звернецца са штогадовым Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу

Выступленне кіраўніка дзяржавы будзе трансляваць ў прамым эфіры па тэлеканале «Беларусь-1» і Першым нацыянальным канале Беларускага радыё. Трансляцыя з Авальнай залы Дома ўрада пачнецца ў 11.00. Тэлеверсія Паслання будзе паказана ў вячэрнім эфіры беларускіх тэлеканалаў.

ДАРОГА ДА СВАЙГО ХРАМА

Фота БЕЛТА.

ГАЛОЎНАЕ — ЗАХОЎВАЦЬ МІР І СПАКОЙ НА БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

У светлае свята Вялікадня, якое сёлета ў адзін дзень адзначалі хрысціяне ўсіх канфесій, у праваслаўных і каталіцкіх храмах краіны ўдзел у святочных набажэнствах прынялі больш за 477 тысяч чалавек. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведаў у гэты дзень мінскі Свята-Духаў кафедральны сабор.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, на Вялікдзень ён, як правіла, наведвае невялікія цэрквы ў рэгіёнах Беларусі, перш за ўсё пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы. Але сёлета Прэзідэнт парушыў традыцыю, «каб у гэтае першае для нас светлае свята Пасхі з новым Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі прысутнічаць у гэтыя хвіліны ўрачыстасці з нашымі людзьмі».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што нават у часы ганення на царкву «ў нас людзі заўсёды ведалі сваю дарогу да свайго храма. Напэўна, таму наша зямля і называецца Белай Руссю — чыстай, добрай».

«Відаць, дзякуючы Госпаду да гэтага часу самыя страшныя ліхалецці абыходзяць нас бокам, калі не лічыць той катастрофы сярэдзіны мінулага стагоддзя, калі нам, усім добрым людзям, давялося змагацца за сваю незалежнасць, за тое, каб жыць на гэтай зямлі. І мы тады не проста адстаялі сваю зямлю, імя якой Беларусь, страціўшы трэцюю частку свайго насельніцтва, — мы выратавалі чалавецтва ад карычневай чумы», — падкрэсліў беларускі лідар, адзначыўшы асаблівую актуальнасць гэтага факта ў год юбілею вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

СТАР. 2

ДАРОЖНАЯ КАРТА СУПРАЦОЎНІЦТВА

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам замежных спраў Арменіі Эдвардам Налбандзянам абмеркавалі пытанні еўразійскай інтэграцыі і ўдзелу ў ёй Арменіі.

«Цяпер ажыццяўляюцца мерапрыемствы, прапісаныя ў дарожнай карце (далучэння Арменіі да Мытнага саюза і АЭП. — **Заўвага БЕЛТА**). Арменія вельмі актыўна працуе ў гэтым кірунку. Я хацеў бы пачуць вашу пазіцыю, пункт гледжання на сённяшні дзень, паколькі літаральна праз некалькі дзён ў Мінску адбудзецца сустрэча кіраўнікоў трох дзяржаў — членаў Мытнага саюза і АЭП», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца двухбаковых беларуска-армянскіх адносін, Прэзідэнт заявіў, што задаволены тэмпамі іх развіцця. «Мы не маем каласальнага таваразвароту. Напэўна, у нас гэтага і не атрымаецца. Але ўлічваючы, што ў нас увогуле быў нулявы таваразварот, сёння гэта вялікі прагрэс», — сказаў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка адзначыў актыўную работу ў Беларусі інвестараў з Арменіі. «Мы заўсёды будзем іх вітаць. Арменія для нас не чужая краіна. Гэта наш сябар, партнёр, гэта краіна, з якой мы і надалей будзем наладжваць самыя цесныя адносіны», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу Эдвард Налбандзян перадаў Прэзідэнту Беларусі цёплыя прывітанні ад прэзідэнта Арменіі Сержа Саргсяна. Ён адзначыў, што леташні візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Арменію быў важным стымулам для далейшага развіцця двухбаковых адносін. Кіраўнік МЗС Арменіі падкрэсліў, што гэтыя адносіны дынамічна развіваюцца на самых розных узроўнях аж да міжрэгіянальнага.

Па словах Эдварда Налбандзяна, гэта датычыцца і тэмпаў росту гандлёвага абароту паміж Беларуссю і Арменіяй, які па выніках 2013 склаў каля $50 млн.

Гаворачы аб тэматыцы еўразійскай інтэграцыі, Эдвард Налбандзян таксама адзначыў наяўнасць добрай магчымасці напярэдадні самітаў у Беларусі, а затым у Казахстане абмеркаваць адпаведныя крокі, якія робіць Арменія па далучэнні да Мытнага саюза.

ЦЫТАТА ДНЯ

Мікалай ЛАДУЦЬКА, старшыня Мінгарвыканкама:

«Гэты тыдзень вельмі адказны ў плане падрыхтоўкі горада да чэмпіянату свету па хакеі. У Мінску павінны завяршыцца ўсе мерапрыемствы па прыбіранні горада. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на тэрыторыі прамысловых прадпрыемстваў і будаўнічыя пляцоўкі, прыватны сектар, дваровыя тэрыторыі. Заказчыкі і падрадчыкі павінны завяршыць усе цыклы мерапрыемстваў па ўсіх аб'ектах, якія мы павінны адкрыць напярэдадні чэмпіянату. З пачатку падрыхтоўкі Мінска да сусветнага першынства па хакеі пройдзены вялікі шлях. Мы павінны ўсё, што стварылі за гэты час, прадэманстраваць гасцям чэмпіянату ў поўнай меры і ў найлепшым выглядзе».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.04.2014 г.

Долар ЗША	9960,00	▲
Еўра	13770,00	▲
Рас. руб.	279,50	▲
Укр. грыўня	891,44	▲

■ Сардэчна запрашаем!

ЦІКАВІНКІ АД ВЫДАВЕЦКАГА ДОМА «ЗВЯЗДА» ДЛЯ ЧЫТАЧОЎ І НЕ ТОЛЬКІ...

Сёння адкрываецца XVIII Міжнародная спецыялізаваная выстава «СМІ ў Беларусі»

На працягу бліжэйшых чатырох дзён у Футбольным манежы можна будзе пазнаёміцца з навінкамі беларускай медыясферы, а таксама завітаць на стэнды сваіх традыцыйна любімых выданняў. Адметную экспазіцыю прадставіць і Выдавецкі дом «Звязда».

СТАР. 2

Сёння — «Прамая лінія»

ДА ЎВАГІ ПАЛЯЎНІЧЫХ І РЫБАЛОВАЎ!

26 чэрвеня ўступае ў сілу новая рэдакцыя правілаў вядзення паляванне і рыбалоўства. Ці можна цяпер будзе зарэгістраваць паляўнічага сабаку без радаслоўнай? Якія дакументы патрэбны, каб займацца такімі папулярнымі відамі рыбалкі, як тролінг і падводнае паляванне? Якія перавагі дае членства ў Беларускім таварыстве паляўнічых і рыбаловаў? Дзе і як максімальна выгадна набыць пуцёўкі на здабычу звера ці лоў рыбы? На гэтыя і іншыя пытанні падчас «прамой лініі» адкажа **старшыня Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» Юрый Іванавіч ШУМСКІ.** Задаць пытанні можна **СЁННЯ з 12.00 да 13.00 гадзін** па тэлефонах: **80172871866, 80172871871.**

■ З першых вуснаў

КАШТОЎНАЯ І ДАКЛАДНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ, ЯКОЙ МОЖНА ДАВЯРАЦЬ

Гэта, на думку міністра інфармацыі Алега ПРАЛЯСКОЎСКАГА, галоўны вызначальны паказчык запатрабаванасці СМІ ў грамадстве

Сёння ў сталічным Футбольным манежы пачынае сваю работу XVIII Міжнародная спецыялізаваная выстава «СМІ ў Беларусі». Усе выданні і тэлерадыёканалы краіны — і цэнтральныя, і рэгіянальныя — на гэтым своеасаблівым аглядзе дасягненняў стараюцца паказаць сябе найлепш перад чытачамі і калегамі, бо выстава — гэта фактычна справаздача аб поспехах, знаходках, новых формах работы, цікавых праектах. «СМІ ў Беларусі» дае яскравае ўяўленне аб тым, якія працэсы адбываюцца сёння ў сродках масавай інфармацыі, наколькі яны адпавядаюць патрабаванням часу, чым жывуць журналісты, якія ў іх працуюць… Але агульную карціну па краіне найлепш ведае, безумоўна, міністр інфармацыі. «Звязда» задала Алегу ПРАЛЯСКОЎСКАМУ пытанні, якія дапамогуць зарыентавацца ў свеце беларускіх СМІ і тым з нашых чытачоў, хто на выставу не трапіць, і тым, хто захоча сам пазнаёміцца з выданнямі, перадачамі і іх аўтарамі.

— Алег Вітольдавіч, канец красавіка — пачатак мая для беларускіх журналістаў заўсёды знакавы: узнагароджваюцца пераможцы «Тэлевяршыні» і «Залатой ліцеры», праходзіць выстава «СМІ ў Беларусі» — па сутнасці, падводзяцца вынікі працы ўсёй беларускай медыяпрасторы за год. Падсумоўваючы мінулыя дванаццаць месяцаў, на чым бы асабліва засяродзіў увагу міністр інфармацыі?

— Мінулы год сканцэнтраваў у сабе вялікую колькасць важных падзей. Многія з іх былі на слыху і актыўна абмяркоўваліся ў беларускім грамадстве і сярод прафесіяналаў сферы.

Перш за ўсё, быў зроблены галоўны крок у рэфармаванні дзяржаўнага сегмента нацыянальнай інфармацыйнай прасторы. Ідэя стварэння буйной медыяструктуры, якая аб'яднала б вядучыя дзяржаўныя друкаваныя выданні, стала рэальнасцю. У выніку рэарганізацыі ўстановы «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия» на яго былі ўскладзены функцыі рэдакцыі газет «Рэспубліка», «Беларуская ніва» (цяпер — «Сельская газета»), «Знамя юности» і «Народная газета».

СТАР. 2

■ Надвор'е

ПРЫПЯЧЭ ДА ПЛЮС 24

А Ў ВЫХАДНЫЯ ПАДМАРОЗІЦЬ

У аўторак на тэрыторыі нашай краіны захавалася цёплае надвор'е, аднак на большай частцы Беларусі ўдзень пройдзе кароткачасовы дождж, паведаміла карэспандэнту «Звязды» спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Сёння ўдзень у асобных раёнах магчымы нават навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 16–22 градусы, а па паўднёвым захадзе прыпячэ нават да 24 цяпла. І ў сераду ўначы ў асобных раёнах, а ўдзень на поўдні Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. А вось у чацвер да нас завітае паветраная маса з боку поўначы Еўропы і пахаладае. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы месцамі ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях магчымы кароткачасовы дождж. Тэмпература паветра ўначы на чацвер знізіцца да плюс 1–6 градусаў, па поўдні — 7–9 цяпла, а ў Віцебскай вобласці месцамі замаразкі да 0-мінус 2 градусаў. Удзень чакаецца 8–14 цяпла, па паўднёвым захадзе — плюс 15–17 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, напрыканцы тыдня атмасферны ціск павялічыцца і ападкаў ужо не будзе.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПОЛЬШЧА ПРАПАНАВАЛА РАЗМЯСЦІЦЬ НА СВАЁЙ ТЭРЫТОРЫІ ВОЙСКІ ЗША

Польшча прапанавала ЗША і НАТА размясціць на сваёй тэрыторыі амерыканскія войскі ў сувязі з падзеямі вакол Украіны. Пра гэта заявіў кіраўнік польскага МЗС Радаслаў Сікорскі ў інтэрв'ю газеце Washington Post, паведамляюць інфармагенцтвы. Сікорскі паведаміў, што на тэму аб павелічэнні колькасці амерыканскага кантынгенту ён гутарыў з дзяржсакратаром ЗША Джонам Кэры і галоўнакамандуючым Аб'яднанымі ўзброенымі сіламі НАТА ў Еўропе амерыканскім генералам Філіпам Брыдлавам. «Мы лічым, што пасля 15 гадоў нашага членства ў НАТА і ў сувязі з падзеямі ва Украіне гэты рэгіён заслугоўвае гарантый бяспекі», — адзначыў кіраўнік польскага МЗС. Паводле яго слоў, ЗША павінны супакоіць саюзнікаў ва Усходняй Еўропе.

У РАСІІ БУДУЦЬ ШТРАФАВАЦЬ КІРОЎЦАЎ-ЦІХАХОДАЎ

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін падпісаў закон, які ўводзіць штраф для кіроўцаў ціхаходных транспартных сродкаў, калі тыя не прапускаюць на вузкіх дарогах аўтамабілі, якія едуць за імі. Згодна з новымі правіламі, кіроўцы машын, якія рухаюцца па-за населеным пунктам з хуткасцю менш за 30 км/г, а таксама аўтамабіляў, якія перавозяць буйнагабарытны груз, будуць аштрафаваны, калі не прапусцяць машыны, якія ідуць на абгон. Штраф для парушальнікаў гэтых правілаў складзе ад 1 да 1,5 тыс. расійскіх рублёў.

ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ АЛЯКСАНДР ЛЯНЬКОЎ

Савецкі і расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст Расіі Аляксандр Лянькоў памёр у ноч на панядзелак на 71-м годзе жыцця ў адной з маскоўскіх бальніц пасля цяжкай працяглай хваробы. Паспяховы акцёр тэатра Массавета Лянькоў шмат здымаўся ў кіно, куды прыйшоў у 1964 годзе, зняўшыся ў фільмах «Дайце кнігу скаргаў» і «Ключы ад неба» — гэтая стужка прынесла яму шырокую вядомасць. Сярод работ Аляксандра Лянькова пераважна ролі ў камедыях («Вясновыя клопаты», «Гаваркая малпа») ці дзіцячых фільмах («Магія чорная і белая», «Таямніца Снежнай каралевы», «Прыгоды Пятрова і Васечкіна»). Не менш пераканаўчым Аляксандр Лянькоў быў і ў карцінах іншых жанраў. Яркія вобразы нязграбных халасцякоў былі створаны артыстам у меладраме «Зімовая вішня» і драме «Маленькая Вера». Шмат гадоў Аляксандр Лянькоў аддаў працы на радыё і ў мультыплікацыі, дзе ў асноўным агучваў казачных персанажаў. Яго голасам гавораць як героі савецкіх і расійскіх, так і дыснееўскіх мультфільмаў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

НАСЫПЦЕ МНЕ 50 ГРАМАЎ... КАНЬЯКУ!

Амерыканскае Бюро па падаткаабкладанні і продажы алкаголю і тытуню ўнесла ў спіс дазволеных да продажу тавараў парашковы алкаголь. Рашэнне было нечаканым нават для вытворцаў, якія не паспелі падрыхтаваць прэзентацыю і сайт, прысвечаны навінкам. Мяркуецца, што гарэлка, ром, а таксама кактэйлі «Махіта», «Маргарыта», «Касманалітэн» і «Цытрынавы лядзяш» паступяць у продаж восенню ў выглядзе 100-грамовых пакуначкаў з парашком пад брэндам Palcohol (гэта значыць «алкаголь у парашку»). Змешваць прадукт прапануецца з безалкагольнымі напоямі. Прадстаўнікі кампаніі Lipsmark таксама дапускаюць магчымасць дабаўлення алкагольнага парашку ў ежу, але катэгарычна не рэкамендуюць яго нюхаць.

КАРАТКА

Расія паставіць у 2014 годзе ў Беларусь 23 млн тон нафты.

На X Нацыянальны конкурс друкаваных сродкаў масавай інфармацыі «Залатая Ліцера» пададзена 218 заявак. У параўнанні з мінулым годам да ўдзелу ў творчым спаборніцтве не дапускаюцца пераможцы мінулага года.

Музычна-забаўляльныя праграмы ў зонах гасціннасці ў Мінску ў час правядзення ЧС па хакеі будуць праходзіць штодзень.

У Беларусі ствараецца міжнародны аўкцыённы дом, які аб'яднае калекцыянераў з Расіі, краін Еўрасаюза, Блізкага Усходу і Паўднёва-Усходняй Азіі.

Беларускі фільм «Сляды апосталаў» Сяргея Талыбава атрымаў спецыяльны прыз міжнароднага фестывалю дэтэктыўных фільмаў і праграм праваахоўнай тэматыкі «Дэтэктыў-ФЭСТ».

■ Абітурыент-2014

ЦТ стартуе 14 чэрвеня

ПРЫ ЗАПАЎНЕННІ ВАКАНТНЫХ МЕСЦАЎ НІЖНІ ПАРОГ БУДЗЕ ЗНІЖАНЫ НА 5 БАЛАЎ

Пастановай Міністэрства адукацыі зацверджаны графік правядзення ў 2014 годзе цэнтралізаванага тэсціравання і пералік устаноў адукацыі, вызначаных як месцы рэгістрацыі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Традыцыйна ЦТ стартуе са здачы абітурыентамі тэсціравання па беларускай мове. Сёлета першы тэст прыпадае на суботу 14 чэрвеня, а ў нядзелю 15 чэрвеня абітурыенты будуць здаваць рускую мову, 17-га — грамадазнаўства, 19-га — біялогію, 20-га — матэматыку, 22-га — гісторыю Беларусі, 23-га — хімію, 24-га — фізіку, 25-га — сусветную гісторыю найноўшага часу, 27-га — замежныя мовы і 28 чэрвеня — геаграфію.

Рэгістрацыя для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні распачнецца 2 мая і будзе доўжыцца да 1 чэрвеня ўключна.

Для абітурыентаў, якія па ўважлівай прычыне прапусцілі цэнтралізаванае тэсціраванне ў асноўны дзень, прадугледжаны рэзервовы дзень — 5 ліпеня. Але здаць у рэзервовы дзень можна будзе толькі адну дысцыпліну. Пунктамі рэгістрацыі абітурыентаў для ўдзелу ў ЦТ у рэзервовы дзень вызначаны Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. Сухога, Беларуска-Расійскі ўніверсітэт і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні ў рэзервовы дзень трэба будзе звярнуцца ў гэтыя ВНУ з 27 чэрвеня па 1 ліпеня для рэгістрацыі. Пунктам правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па ўсіх вучэбных прадметах у рэзервовы дзень стане Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

Міністэрства адукацыі вызначылася таксама і з ніжнім парогам балаў на ЦТ, якія дазволяць абітурыентам удзельнічаць у конкурсе на атрыманне вышэйшай адукацыі.

СТАР. 2

ДАРОГА ДА СВАЙГО ХРАМА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка выказаў шкадаванне ў сувязі з тым, што чалавецтва так і не зрабіла высноў са страшных падзей таго часу. «На жаль, мы з кожным годам губляем асновы нашай духоўнасці, забываемся пра тое, што нельга забываць. Сведчаннем таму з'яўляюцца цяжкія падзеі ў нашых братоў ва Украіне,— адзначыў Прэзідэнт, дадаўшы: — Мы, вядома, будзем рабіць усё для таго, каб Украіна жыла спакойна».

Прэзідэнт нагадаў, што яшчэ год таму шмат гаварылася пра так званую арабскую вясну, пра Сірыю, дзе ідзе вайна. «Я тады вам гаварыў у Пасланні беларускаму народу: не думайце, што гэта так далёка ад нас, свет сёння настолькі цесны, што казаць пра тое, што гэта далёка, непрымальна. Глядзіце, як атрымалася: гэта ўжо (падзеі ва Украіне.— **Заўвага БЕЛТА.**) нават не ля нашага парога, гэта ўжо ў нас»,— адзначыў Аляксандр Лукашэнка

«Я гэта кажу для таго, каб вы яшчэ раз засвоілі вялікую ісціну: няма на свеце нічога даражэйшага за мір і спакой. Толькі тады мы можам спакойна жыць, ладзіць сваё жыццё і маліцца»,— сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама заклікаў памятаць, што сёння на падмурку Святой Русі існуе ядро з трох дзяржаў, якія з'яўляюцца асновай, у тым ліку, і праваслаўнай веры. Гаворачы пра Беларусь, Прэзідэнт падкрэсліў, што гэтая зямля заўсёды будзе належаць грамадзянам краіны, не толькі беларусам, але і рускім, яўрэям, палякам, украінцам — усім, хто на ёй жыве. «Мы ніколі не дапусцім, каб з гэтай святой зямлі выходзіла пагроза перш за ўсё нашым суседзям і іншым народам свету. Мы павінны падараваны Госпадам Богам імідж нашага народа як самых добрых, светлых і святых людзей пранесці праз сваё жыццё. Мы гэта павінны памятаць заўсёды. Таму мір і спакой — галоўнае, што мы павінны сёння захаваць, гэта галоўнае, за што мы павінны змагацца. Наша дзяржаўнасць непахісная, і ўсялякія размовы пра тое, што мы заўтра ўвойдзем у нейкія дзяржавы, для Беларусі непрымальныя»,— падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў увесь беларускі народ і служыцеляў царквы са святам Вялікадня, падкрэсліўшы, што ў Беларусі няма міжканфесійнай або міжнацыянальнай варожасці. Асобна цёплыя словы Аляксандр Лукашэнка адрасаваў ганароваму Патрыяршаму Экзарху ўсяе Беларусі Мітрапаліту Філарэту, які па стане здароўя не змог прысутнічаць у храме.

У саборы Аляксандр Лукашэнка папрысутнічаў на велікодным набажэнстве і запаліў свечку ля Мінскай іконы Божай Маці, абмяняўся з Мітрапалітам Паўлам падарункамі з нагоды гэтага светлага свята. Перададзенае ў дар Прэзідэнтам Беларусі велікоднае яйка створана ва ўнікальнай тэхніцы сожскай скані. Усярэдзіне сферы размешчана мініяцюрная выява букета кветак, па баках — два разныя медальёны з выявамі святых Пятра і Паўла. Вянчае яйка разны крыж.

У ПАРЛАМЕНТ УНЕСЕНЫ ЗАКОНАПРАЕКТ АБ АМНІСТЫІ

Аляксандр Лукашэнка 21 красавіка ўнёс на разгляд у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу праект закона Рэспублікі Беларусь «Аб амністыі ў сувязі з 70-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў». Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Дакумент падрыхтаваны па ініцыятыве кіраўніка дзяржавы. «Мэтай распрацоўкі гэтага законапраекта з'яўляецца забеспячэнне сацыяльнай справядлівасці пры выкананні крымінальных санкцый шляхам прымянення да асуджаных, якія даказалі сваё выпраўленне, амністыі як вышэйшай праявы гуманізму з боку дзяржавы», — адзначылі ў прэс-службе.

З улікам папярэдняга вопыту правядзення амністый у нашай краіне праектам закона прадугледжана вызваленне ад крымінальнай адказнасці і пакарання катэгорый асоб, якія ў найбольшай ступені заслугоўваюць спагадлівасці. Гэта, у прыватнасці, непаўналетнія, цяжарныя жанчыны, асобы пенсійнага ўзросту, інваліды, ветэраны баявых дзеянняў, грамадзяне, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Амністыі будуць падлягаць тыя з названых асоб, што ўчынілі злачынствы, якія не адносяцца да катэгорыі цяжкіх і асабліва цяжкіх.

Асобныя катэгорыі асуджаных, якія не падлягаюць вызваленню ад адбывання пакарання поўнасцю, згодна з праектам закона вызваляюцца ад пакарання часткова тэрмінам на адзін год.

Амністыя не будзе распаўсюджвацца на асоб, якія ўчынілі найбольш цяжкія злачынныя дзеянні, такія як наўмыснае забойства, згвалтаванне, гандаль людзьмі, стварэнне злачыннай арганізацыі, бандытызм, тэрарызм, а таксама не выканалі прадугледжаныя праектам закона ўмовы для вызвалення ад крымінальнай адказнасці і пакарання.

Паводле папярэдніх разлікаў Міністэрства ўнутраных спраў, пры рэалізацыі закона прадугледжваецца поўнасцю вызваліць ад пакарання каля 2730 чалавек і скараціць тэрмін адбывання пакарання на адзін год у адносінах прыкладна да 5500 чалавек.

КАМАНДА ПРЭЗІДЭНТА СТАЛА ПЕРШАЙ СЯРОД АМАТАРАЎ ХАКЕЯ

Хакейная каманда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пяты раз стала пераможцам рэспубліканскіх спаборніцтваў па хакеі з шайбай сярод аматараў на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, паведамляе БЕЛТА.

У першым матчы фінальнай серыі 12 красавіка ў Гродне прэзідэнцкая лядовая дружына выйграла ў хакеістаў Гродзенскай вобласці з лікам 9:7 (2:1, 5:2, 2:4), а 19 красавіка ў Мінску на лёдзе «Чыжоўка-Арэны» дабілася вікторыі з лікам 9:6 (4:0, 4:3, 1:3). Гульня праходзіла з вялікай перавагай прэзідэнцкай дружыны, і ўжо да першага перапынку яна вяла з лікам 4:0. У другой 20-хвілінцы гледачы ўбачылі яшчэ 7 закінутых шайбаў — 4:3 на карысць гаспадароў. У заключным перыядзе госці закінулі 3 шайбы, прапусціўшы толькі адну.

Цяперашнія спаборніцтвы аматарскіх каманд праводзіліся ўжо сёмы раз, і ў пяці з іх першынствавала хакейная каманда Прэзідэнта.

КАШТОЎНАЯ І ДАКЛАДНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ, ЯКОЙ МОЖНА ДАВЯРАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Варта адзначыць, што вельмі далікатная праца па аб'яднанні медыяструктур была праведзена максімальна карэктна. Ніхто не быў пакрыўджаны або выкінуты на вуліцу. Журналісты далучаных выданняў у матэрыяльным плане нават выйгралі ад рэарганізацыі.

Напярадзе ў створанай структуры, вядома, яшчэ шмат работы. Бо трэба будзе выпрацаваць і рэалізаваць аптымальную мадэль прысутнасці на інфармацыйным рынку беларускіх друкаваных выданняў. Гэта датычыцца і тэматычнай спецыялізацыі кожнай газеты, і фармату выпуску. Але я ўпэўнены, што гэтыя задачы будуць вырашаны гэтак жа паспяхова, як юрыдычныя і фінансавыя пытанні.

Другая найважнейшая падзея мінулага года — пачатак пераходу Беларусі на лічбавае тэлевяшчанне. Аналагавае вяшчанне ўжо адключана ў Асіповіцкім, Бабруйскім, Жлобінскім, Касцюковіцкім раёнах, горадзе Гомелі. Пры гэтым былі цалкам улічаны інтарэсы нашых людзей. Пра гэта сведчыць тое, што ў Міністэрства інфармацыі скаргі, звязаныя з пераходам на лічбавае эфірнае тэлевізійнае вяшчанне, за мінулы перыяд не паступалі. Упэўнены, што ў 2014 годзе мы паспяхова завершым гэты працэс. І людзі ад такіх пераўтварэнняў толькі выйграюць: яны атрымаюць доступ да большай колькасці якасных тэлевізійных каналаў.

Былі ў нас у 2013 годзе і іншыя перамогі, вялікія і не вельмі. Адкрыты спартыўны тэлеканал «Беларусь 5», які адразу завяваў папулярнасць у аўдыторыі гледачоў. У новым фармаце пачаў працаваць наш спадарожнікавы канал «Беларусь 24». На рынку, як на рэспубліканскім, так і на рэгіянальным, з'явіліся новыя дынамічныя ігракі. У прыватнасці, заявілі пра сябе створаныя на базе абласных выдавецкіх інфармацыйныя агенцтва «Магілёўскія ведамасці» і рэдакцыя газеты «Витебские вести». Імкліва развівалася большасць раённых СМІ. А калі расце канкурэнцыя, то расце і якасць кантэнту. У гэтым і ёсць мэта нашай працы ў галіне.

— Выстава «СМІ ў Беларусі» апошнія некалькі гадоў праходзіць пад адным дахам і адначасова з міжнародным форумам па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях «TIBO», на якім, як правіла, прадстаўляюцца найноўшыя дасягненні ў галіне высокіх тэхналогій і іх практычнае прымяненне ў жыцці. Гэта прымушае і друкаваныя СМІ «падцягвацца» да ўзроўню: газеты і часопісы ладзяць электронныя прэзентацыі, прадстаўляюць магчымасці сваіх інтэрнэт-версій. Удзельнікі «СМІ ў Беларусі» сёння могуць стаць канкурэнтаздольнымі ўдзельнікамі «TIBO»?

— На мой погляд, формы і аб'ём прысутнасці дзяржаўных СМІ ў інтэрнэце развіваюцца не менш дынамічна, чым самі рэдакцыі ў цэлым. І гэта заканамерна, таму што рэарганізацыя медыяструктур на ўсіх узроўнях — немалая праца за мінулы год прайшла, дарэчы, у рэгіёнах — мае сваёй мэтай павышэнне эфектыўнасці іх дзейнасці, у першую чаргу, з аўдыторыяй. А рашэнне гэтай задачы без эфектыўнага асваення інтэрнэт-прасторы немагчыма.

За апошнія гады мы дабіліся таго, каб усе дзяржаўныя друкаваныя выданні былі прадстаўлены ў інтэрнэце. Пры гэтым мы разумелі, што фармальная наяўнасць пляцоўкі, дзе вывешваюцца матэрыялы,— гэта не канчатковая мэта і не «рэч у сабе». Галоўнае — эфектыўная праца з аўдыторыяй, для якой сайт — гэта толькі прылада ў шэрагу іншых. Таму мы пастаянна падштурхоўвалі рэдакцыі да пашырэння іх функцыяналу ў інтэрнэце, да больш актыўнай працы. Як вынік — кожны год з'яўляюцца добрыя новыя праекты дзяржаўных СМІ, у тым ліку ў абласцях. У якасці прыкладаў можна назваць новыя або абноўленыя інтэрнэт-праекты газет «Витебские вести», «Віцьбічы», «Гомельская праўда», «Гродзенская праўда». Сярод вэб-рэсурсаў раённых выданняў адзначу, перш за ўсё, сайты газет «Ударны фронт» (Шклоў), «Маяк» (Бяроза), «Жыццё Палесся» (Мазыр), «Пухавіцкія навіны», «Маладзечанскай газеты», «Ашмянскага весніка», «Аршанскай газеты» і іншых.

На новы, больш магутны фармат інтэрнэт-вяшчання перайшоў тэлеканал «АНТ». Створаны інтэрнэт-партал Выдавецкага дома «Звязда», які ўдала аб'яднаў у сабе масава-палітычны і літаратурна-мастацкі сегменты. Добра, што пачалі працаваць у сацыяльных сетках, станоўчыя вынікі ўжо ёсць.

Планамерна ўзмацняе прысутнасць у інтэрнэце наша галоўная газета — «Советская Белоруссия». У рэйтынгу інтэрнэт-рэсурсаў інтэрнэт-партал «СБ. Беларусь сегодня» ўпэўнена лідзіруе ў катэгорыі «Друкаваныя СМІ ў інтэрнэце».

— Нядаўна на сустрэчы з калектывамі брэсцкіх абласных газет вы расказалі, што рэфармаванне беларускай медыясферы працягнецца, асаблівую ўвагу звярнуўшы пры гэтым на стварэнне магутнага веб-рэсурсу «СМІ ў Беларусі», на якім будуць прадстаўлены ўсе сродкі масавай інфармацыі краіны. Але многія інтэрнэт-карыстальнікі могуць даволі скептычна паставіцца да гэтай ідэі: парталы некаторых «раёнак», мякка кажучы, прымушаюць жадаць лепшага, а на агульным рэсурсе побач з яскравымі прыкладамі ўдалага асваення інтэрнэт-прасторы кантраст будзе відавочны…

— Дык гэта якраз і патрабуецца! Каб самі рэдакцыі маглі паглядзець на сябе, на сваю працу збоку. Бо, скажам шчыра, абласныя, а часта — і раённыя, гарадскія газеты часта жывуць у сваіх рэгіянальных нішах і ўспрымаюць рэспубліканскую і ўжо тым больш замежную прэсу — як некаторую іншую рэальнасць, да якой яны не могуць мець адносін.

А цяпер уявіце — на адным вялікім рэспубліканскім рэсурсе будуць збірацца і падавацца публіцы лепшыя матэрыялы з усіх СМІ, незалежна ад іх тэрыторыі распаўсюджвання. І акажацца, што, скажам, матэрыялы некаторых раённых газет па пэўнай тэматыцы (напрыклад, па краязнаўстве, па сацыяльнай праблематыцы) выклічуць жывую цікавасць у карыстальнікаў партала. Гэта ж найкаштоўная інфармацыя для рэдакцый, важны арыенцір для далейшай працы, сапраўдная падзея. Можа, яны зразумеюць, што могуць мець сваю аўдыторыю і на рэспубліканскім, і на міжнародным узроўні. Вось такога эфекту мы чакаем ад працы партала.

Важныя пры гэтым, вядома, і больш простыя моманты — каб рэгіянальшчыкі проста чыталі адзін аднаго, бачылі, як трэба працаваць у інтэрнэце, прасоўваць свой кантэнт. Аператарам партала стане рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Там ёсць прафесіяналы, у якіх можна і варта гэтаму павучыцца.

— Апошнім часам многіх журналістаў хвалюе пытанне абароны аўтарскіх правоў у інтэрнэт-прасторы. Плагіятараў у інтэрнэце хапае, а злавіць іх «на гарачым» і прыцягнуць да адказнасці амаль немагчыма. Ці не плануюцца з боку міністэрства нейкія захады прававога, заканадаўчага характару, каб урэгуляваць гэтую праблему?

— Як і нашы суседзі, мы прапрацоўваем пытанні, звязаныя з увядзеннем паняцця інтэрнэт-СМІ — гэта значыць, сродкі масавай інфармацыі, якія распаўсюджваюць свой кантэнт праз інтэрнэт. Гэта дазволіць надаць адпаведны прававы статус як журналістам, так і кантэнту тых рэсурсаў, якія захочуць стаць інтэрнэт-СМІ. Адпаведна, узмоцніцца і абарона аўтарскіх правоў.

Але хачу звярнуць увагу на тое, што клопат аб захаванні аўтарскіх правоў у дачыненні да матэрыялаў рэдакцыі — гэта абавязак, у першую чаргу, саміх рэдакцый. Такія стандарты працы ў сферы інтэлектуальнай уласнасці. Праваўладальнік павінен быць больш за ўсіх зацікаўлены ў абароне сваіх інтарэсаў і павінен сам прыкладаць намаганні для адсочвання і спынення парушэнняў яго правоў.

— Шмат гаворыцца пра тое, што ў «папяровай» журналістыкі няма будучыні, усе пяройдуць, у рэшце рэшт, у прастору віртуальную… Міністр інфармацыі з гэтым пагодзіцца ці ў яго ёсць што запярэчыць?

— Вы ведаеце, Міністэрства інфармацыі працуе не толькі са сродкамі масавай інфармацыі, але таксама выконвае функцыі рэгулявання на рынку выдавецкіх паслуг у цэлым, у тым ліку — у кнігавыданні. І на прыкладзе кнігавыдання, куды ў апошнія гады таксама прыйшлі высокія тэхналогіі, якія істотна змянілі рынак, можна зразумець, як будуць пад уплывам «лічбы» развівацца друкаваныя СМІ.



Ці знікнуць папяровыя кнігі? Упэўнены, што не. Таму што ёсць нішы, у якіх папяровыя кнігі з'яўляюцца незаменнымі: пачынаючы ад дзіцячых кніжак, якія маленькае дзіця нават не чытае, а проста гартае, развіваючы маторыку і разглядаючы малюнкі, і заканчваючы эксклюзіўнымі калекцыйнымі выданнямі збору твораў і гэтак далей. У гэтых нішах, а іх вельмі шмат, кнігі застануцца. У іншых сегментах тыражы будуць, вядома, скарачацца.

Нешта падобнае, на мой погляд, будзе адбывацца і са сродкамі масавай інфармацыі. Зразумела, што па аператыўнасці, разнастайнасці фарматаў, нагляднасці інтэрнэт з'яўляецца недасягальным для «папяровых» выданняў. Аднак сіла інтэрнэту, яго ўсёабдымны, універсальны характар усё больш працуе супраць яго. У інфармацыйным шуме становіцца ўсё складаней знайсці сапраўды каштоўную і дакладную інфармацыю, якой можна даверяць. На гэтым фоне папяровыя СМІ, якія ўяўляюць сабой, па сутнасці, паўнавартасныя дакументы, адказнасць за дакладнасць якіх нясуць канкрэтныя людзі, атрымліваюць новую прывабнасць.

Ёсць і іншы момант: інтэрнэт-рэсурсы часта жывуць толькі за кошт рэкламы. А на адной рэкламе пабудаваць паўнавартасную рэдакцыю вельмі няпроста, асабліва калі гаворка ідзе пра рэдакцыю, якая працуе на невялікім нацыянальным або рэгіянальным рынку. У выніку з'яўляюцца платныя матэрыялы ў інтэрнэце. Але паколькі за інтэрнэт-матэрыялы ўжо трэба плаціць, то ці не будзе карысці для чалавека за тыя ж або амаль за тыя ж грошы атрымліваць яшчэ і «папяровы» варыянт выдання? Прыкладна ў такой логіцы будуецца маркетынгавая стратэгія лонданскай Financial Times.

Адным словам, друкаваныя СМІ не знікнуць. Іх рынкавая ніша, вядома, звузіцца, але аб ліквідацыі гаворка не ідзе. І ўжо тым больш гаворка не можа ісці аб знікненні «папяровай» журналістыкі. Бо яе прынцыпы з'яўляюцца асновай і для «тэкставай» інтэрнэт-журналістыкі.

Алена ЛЯЎКОВІЧ, Юрый ЦАРЫК.

ЦІКАВІНКІ АД ВЫДАВЕЦКАГА ДОМА «ЗВЯЗДА» ДЛЯ ЧЫТАЧОЎ І НЕ ТОЛЬКІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёння, а 13-й гадзіне, будуць прэзентаваны даўно любімыя вамі газеты «Звязда», «Літаратура і Мастацтва», часопісы «Полымя», «Нёман», «Вожык», «Маладосць», а таксама часопіс «Родная прырода», які наш Выдавецкі дом узяў пад сваё крыло нядаўна, але які ўжо займеў сваіх прыхільнікаў. Можна будзе зазірнуць у гісторыю выданняў, а таксама пазнаёміцца з рэаліямі, даведаўшыся пра цікавыя праекты, актуальныя творчыя знаходкі, паўдзельнічаць у віктарынах.

Асобную прэзентацыю будзе мець добра вядомы вам праект «Дарогамі вызвалення», прысвечаны 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яго вы пастаянна маглі бачыць на старонках «Звязды».

Наведвальнікі змогуць прыняць удзел у вызначэнні 10-ці самых папулярных твораў беларускай літаратуры XX стагоддзя. Такая магчымасць у іх з'явіцца падчас пачатку рэспубліканскай акцыі «Топ-10 любімых твораў беларускай класікі», аб'яўленай часопісам «Полымя». Прыхільнікі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» атрымаюць рэдкую магчымасць апынуцца на першай паласе любімага выдання. Для гэтага трэба проста прыйсці на выставу і… стаць героем самага лепшага фотаздымка гэтага дня.

Мастак-карыкатурыст часопіса «Вожык» Аляксандр Каршакевіч будзе рабіць экспрэс-партрэты сваіх падпісчыкаў. Шчасліўчыкі, якім пашанцуе быць намаляванымі спрактыкаваным майстрам, свае партрэты змогуць забраць з сабой на памяць.

23 красавіка, аб 13-й гадзіне, пачнецца кансультацыя псіхолага Настассі Гарэлік, якая завітае на звяздоўскі праект «Краіна здароўя». На наступны дзень, аб 11-й гадзіне, пастаянныя аўтары Аксана Катовіч і Янка Крук асабіста прадставяць свае «Залатыя правілы народнай культуры» і штодзённы праект «Народжаныя».

У апошні дзень мерапрыемства, а 11-й гадзіне, адбудзецца аўтограф-сесія аўтара кнігі «Чамадан з кракадзілавай скуры» Алены Беланожка, таксама аўтарамі і складальнікамі кнігі «Скрозь «Маладосць».

У дні выставы на стэндзе «Белпошты» можна будзе падпісацца на любую газету ці часопіс Выдавецкага дома «Звязда», атрымаўшы зніжку. Акрамя таго, ільготы прадастаўляюцца ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і пенсіянерам. Газета «Літаратура і мастацтва», часопісы «Полымя», «Нёман», «Маладосць» прапануюць больш нізкі падпіскны кошт настаўнікам, часопіс «Вожык» — жыхарам сельскай мясцовасці.

Прыходзьце! Абяцаем: будзе цікава!

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

ЦТ стартуе...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для таго, каб мець магчымасць падаць дакументы ў ВНУ для атрымання вышэйшай адукацыі першай ступені, абітурыенты павінны будуць набраць не менш як 10 балаў на ЦТ па рускай і беларускай мове, 15 балаў — на ЦТ па матэматыцы, фізіцы, хіміі і біялогі і 20 балаў — на тэсціраванні па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі найноўшага часу, грамадазнаўстве, геаграфіі і замежных мовах. Як і было абяцана, парог застаўся на тым жа ўзроўні, што і летась. Але з'явіліся дадатковыя паслабленні для тых, хто будзе паступаць на бюджэтныя месцы ў рамках дадатковага набору ў дзяржаўныя ВНУ на месцы, што засталіся вакантнымі пасля залічэння абітурыентаў. Для іх гэты парог будзе ніжэйшы: у сертыфікатах па рускай і беларускай мовах абітурыенты павінны будуць мець не менш як 5 балаў, па матэматыцы, фізіцы, хіміі і біялогіі — 10 і 15 балаў — па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі найноўшага часу, грамадазнаўстве, геаграфіі і замежных мовах.

У Міністэрстве адукацыі падкрэсліваюць, што для таго, каб засвоіць універсітэцкую праграму і не дыскрэдытаваць дыплом аб вышэйшай адукацыі, абітурыент павінен мець пэўны патэнцыял. Устаноўлены ўзровень тэставых балаў дазволіць адсеяць пры паступленні ў ВНУ слаба падрыхтаваных абітурыентаў. Станоўчыя значэнні тэставых балаў вызначаліся з улікам праведзенага аналізу вынікаў ЦТ за некалькі апошніх гадоў. У прыватнасці, аналізаваўся працэнт выканання заданняў у тэстах, узровень складанасці заданняў, а таксама праводзіўся аналіз вынікаў конкурснага адбору ва ўстановы вышэйшай адукацыі ў мінулыя гады.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ВЯЛІКДЗЕНЬ У ЗАСЛАЎІ

Заслаўе, адзін з самых старажытных гарадоў нашай краіны, таксама сустрэў Уваскрэсенне Хрыстова. Тут адбыліся велікодныя набажэнствы ў праваслаўным Спаса-Праабражэнскім храме і каталіцкай Царкве Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі. Шмат вернікаў прыйшлі памаліцца, аддаць падзяку Госпаду, пачуць радаснае велікоднае прывітанне «Хрыстос уваскрэс!», асвяціць велікодную выпечку і, нарэшце, захапіць з сабой часцінку Дабрадатнага агню.

Надзея БУЖАН, фота аўтара.

г. Заслаўе.

Велікодная служба ў заслаўскім касцёле Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі.

■ Стасункі

ПЕРАСЦЯРОГІ І ІНТАРЭС

Беларуска-турэцкія сувязі дынамічна развіваюцца. Турэцкія прадпрымальнікі актыўна інвестуюць у нашу краіну. Пры гэтым аб'ём іх укладанняў значна перавысіў па сукупным аб'ёме інвестыцый многія буйныя эканомікі краін Еўрасаюза. Значныя будоўлі Беларусі часта прыцягваюць турэцкіх будаўнікоў, якія ў гэтым сегменце глабальнай сферы паслуг упэўнена знайшлі сваю нішу.

Пра пазітыўны настрой да нашай краіны ў турэцкіх палітычных колах сведчыць адмова Турцыі прымяняць санкцыі ў дачыненні да Беларусі, якія некалькі гадоў таму ўвялі Еўрасаюз і ЗША. Пры гэтым Турцыя з'яўляецца членам НАТА і мае статус кандыдата на ўступленне ў Еўрасаюз. Як бачым, знешняя палітыка краіны, нягледзячы на гэтыя асаблівасці, цалкам незалежная.

У сувязі з мноствам пазітыўных падзей у беларуска-турэцкіх стасунках кафедра міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і Еўразійскі інстытут Стамбульскага ўніверсітэта правялі ў Стамбуле міжнародны сімпозіум «Турэцка-беларускія адносіны: перспектывы новай будучыні». Вялікую ролю ў правядзенні сімпозіума адыграла таксама грамадскае аб'яднанне «Дыялог Еўразія».

Дырэктар Еўразійскага інстытута Стамбульскага ўніверсітэта Бекір ГЮНАЙ, вітаючы ўдзельнікаў сімпозіума, адзначыў важнасць развіцця адносін Турцыі з Беларуссю. Новы імпульс развіццю гэтых стасункаў павінна надаць адмена віз, якія раней стваралі цяжкасці ў наладжванні ўзаемных кантактаў. Выступаючы па тэме свайго даклада «Роля беларуска-турэцкіх адносін у рамках еўрапейскай супольнасці», ён адзначыў, што сёння ў рамках Еўрапейскага саюза адбываецца працэс фарміравання Германіяй новай імперыі. Яна ідзе да гэтай мэты, аб'ядноўваючы вакол сябе іншыя дзяржавы. Ад руху па гэтым шляху, асіміляцыі дробных краін больш буйнымі ў рамках інтэграцыйных структур, павінен устрымацца Еўразійскі эканамічны саюз, які фарміруецца. Калі вобразна параўнаць буйныя краіны з магнітам, а дробныя з іголкамі, то магніт павінен не толькі прыцягваць іголкі, але і сам рухацца да іх. Прафесар Гюнай звярнуў увагу на лёс Украіны, якая аказалася ў ролі іголкі паміж двума моцнымі магнітамі і з-за гэтага перажывае сур'ёзныя цяжкасці.

Выступаючы з вітальным словам, я асабліва адзначыў, што важным фактарам развіцця беларуска-турэцкіх адносін з'яўляюцца даўнія гістарычныя і культурныя сувязі двух народаў. Вялікую ролю адыгрывае і традыцыйнасць беларускай і турэцкай культур — яны абапіраюцца на праваслаўе і ісламскія апелююць да гістарычных каранёў, стрымана ставяцца да сацыяльных наваўвядзенняў, што занадта паспешна прасоўваюцца на Захадзе. Імкненне арыентавацца на дзяржаву і грамадскія інтарэсы, з павагай ставіцца да сямейных каштоўнасцяў, характэрна як для грамадзян Турцыі, так і Беларусі, што і спрыяе развіццю ўзаемаразумення і дыялогу.

У сваім дакладзе, які быў прысвечаны развіццю беларуска-турэцкіх адносін у кантэксце развіцця абедзвюма краінамі стасункаў з Кітаем, я адзначыў таксама, што не ўсе краіны свету гатовы пазітыўна ацэньваць высокі ўзровень сувязяў паміж Кітаем і Беларуссю, Кітаем і Турцыяй. Асабліва выражана незадаволенасць гэтым з боку заходніх краін, якія асцерагаюцца страціць свой уплыў на сусветныя працэсы з-за набыцця Кітаем новых партнёраў і саюзнікаў.

Турцыя асабліва адчула такое стаўленне да сябе пасля рашэння набыць у Кітая сучасныя ракеты для ўдасканалення сваёй сістэмы абароны.

На жаль, цяпер абедзве краіны маюць пэўныя цяжкасці і ў развіцці адносін з Кітаем. Сярод галоўных — малы аб'ём інвестыцый з боку Кітая і праблемы ў гандлі. Кітайскія інвестыцыі і ў Турцыю, і ў Беларусь зусім нязначныя для такой вялікай эканомікі. Беларусь у гэтай сувязі стала прыцягваць інвестыцыі праз дзяржаўныя каналы, заснаваўшы, у прыватнасці, Кітайска-беларускі індустрыяльны парк.

Што да праблем у гандлі з Кітаем, то для таваразвароту абедзвюх краін характэрна агульная тэндэнцыя — вялізнае адмоўнае сальда. Агульныя праблемы ў гандлі з Кітаем могуць паслужыць падставай для сумесных дзеянняў кіраўніцтва Турцыі і Беларусі для іх вырашэння. У прыватнасці, можна прапанаваць Кітаю стварыць сумесныя турэцка-кітайска-беларускія транснацыянальныя карпарацыі.

Дацэнт Ільяс КЕМАЛОГЛУ заўважыў на сімпозіуме, што 5 тысяч турыстаў за год з Турцыі ў Беларусь — вельмі малая лічба. Ён выказаў надзею, што сітуацыя выправіцца. Заклікаў актыўна нарошчваць таваразварот. На яго думку, цяперашнія паўмільярда долараў ва ўзаемным гандлі не адпавядаюць наяўнаму патэнцыялу.

Аб сучасных выкліках і пагрозах у памежнай сферы ў краінах, якія ўдзельнічаюць у еўразійскай інтэграцыі, расказалі супрацоўнікі Інстытута памежнай службы Рэспублікі Беларусь палкоўнік Сяргей Волкаў і маёр Вадзім Серабракоў. Забеспячэнне калектыўнай памежнай бяспекі павінна надзейна супрацьдзейнічаць пранікненню праз знешнія межы міжнародных тэрарыстычных і экстрэмісцкіх арганізацый, сродкаў тэрору і дыверсій, а таксама дзейнасці трансгранічных злачынных груп па незаконным перамяшчэнні праз знешнюю мяжу ЕўрАзЭС наркатычных сродкаў, матэрыяльных і культурных каштоўнасцяў, арганізацыі каналаў нелегальнай міграцыі. І супрацоўніцтва Беларусі і Турцыі па гэтых накірунках будзе іграць вялікую ролю для еўразійскай бяспекі.

Галоўнай дамінантай сімпозіума стаў агульны настрой на пошук новых рашэнняў па развіцці беларуска-турэцкіх адносін. Яму спрыяла і агульная атмасфера Стамбула — вялікага горада, што дынамічна развіваецца і гістарычная скіраванасць ісламская спадчына якога мае вялікае значэнне і для грамадзян Турцыі, і для грамадзян нашай краіны.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

■

■ Акцыя

«ЧЫСТЫ ВАДАЁМ»

Акцыю пад такой назвай абвясціла праўленне рэспубліканскага савета Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Пройдзе яна з 21 па 27 красавіка. Далучыцца да акцыі можа любы грамадзянін, неабыякавы да роднай прыроды, а таксама арганізацыі і ўстановы.

У нашай краіне налічваецца 20,8 тысячы рэк агульнай працягласцю 90,6 тысячы кіламетраў, звыш 10 тысяч азёраў, больш за 150 буйных і 1,5 тысячы невялікіх вадасховішчаў. Водныя аб'екты сталі ўлюбёным месцам адпачынку не толькі жыхароў нашай краіны, але і шматлікіх замежных гасцей. Акцыя «Чысты вадаём», гаворачы яе арганізатары, у першую чаргу скіравана на навядзенне парадку ў прыбярэжнай зоне напярэдадні адкрыцця сезона актыўнага адпачынку на прыродзе. Па пытаннях удзелу ў мерапрыемстве можна звяртацца ў раённыя падраздзяленні Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

Ігуменскі тракт

№ 13 (71)

■ Калекцыя

Пад патранатам Святога Губерта

Да кожнага прадмета ў музеі можна дакрануцца

Узяць у свае рукі экспанат і разгледзець яго больш дэталёва можна ў незвычайным музеі ў Гродне. У пяці пакоях прыватнага жылога дома сабраны самыя неверагодныя рэчы: ад старых паштовак, царскіх аптэчных рэцэптаў, карцін, бюстаў вядомых асоб да сякер часоў Грунвальдскай бітвы, посуду, мэблі, фотаапаратаў, кавалкаў Берлінскай сцяны... Усе экспанаты музея нейкім чынам звязаны з гісторыяй Гродна ці распавядаюць пра яго стваральніка — адметнага гродзенца Януша Паруліса.

У цагляным доме па дарозе да Каложы пяць пакояў займаюць экспанаты, якія знаходзяцца ў цесным суседстве адзін з адным. Іх назбіралася столькі, што хапіла б на некалькі музеяў. «Мне дасталася добрая спадчына, — распавядае пра ўласны музей побыту Януш Паруліс. — Мой дзед заўсёды збіраў рэчы. Было шмат кніжак, фотаздымкаў, паштовак, карт. Ён казаў, што ўсё можа спатрэбіцца. А ў мяне было дзе гэта паставіць і захаваць».

У апошнім пакоі змешчана экспазіцыя з фотаздымкамі Элізы Ажэшкі, якая жыла ў Гродне.

Пры ўваходзе ў музей натыкаешся на станок чыгуналіцейнага завода, які ў свой час існаваў у г. Гродне. Януш Паруліс кажа, што горад калісьці быў вялікім прамысловым цэнтрам. Другі экспанат, які трапляецца на маім шляху, — гэта шыльда абутковай крамы, у якой прадаваўся тэнісны абутак. Па словах Януша Стэфанавіча, г. Гродна быў і вялікім спартыўным цэнтрам, таму што ніхто не прадаваў бы тут тэнісны абутак, каб у горадзе не было кортаў... «У маіх кнігах па даваеннай гісторыі горада сказана, што тут былі два корты, — дадаў Януш Паруліс. — Але гэта толькі афіцыйныя карткі, прыватных было значна больш».

Сярод іншых экспанатаў — станок, які рабіў фірменныя цісненні, «баташаўскі» самавар, медны балон ад вады з Друскінінкая, які да стварэння музея Паруліса захоўваўся ў аптэцы-музеі Гродна, частка каміна з завода Станіслава II Аўгуста Панятоўскага.

Нетрадыцыйныя экспанаты для музея — кавалкі Берлінскай сцяны. «У свой час я там быў, — успамінае Януш Стэфанавіч. — Паўсвету прыязджала і купляла сабе кавалкі гэтай сцяны на памяць. Вось і сабе ў Гродна прывёз пяць кілаграмаў». Сярод музейных прадметаў таксама фотаапараты, якім па 120—150 гадоў, кансолі, плеценае крэсла, баявыя сякеры (па словах іх сённяшняга ўладальніка, часоў ажно Грунвальдскай бітвы). Акрамя таго, тут ёсць міні-галерэя з карцінамі, напісанымі да 50-х гадоў мінулага стагоддзя, літаграфіямі. У апошнім пакоі змешчана экспазіцыя з фотаздымкамі Элізы Ажэшкі, якая жыла ў Гродне. Захавальнік музея прыгадвае, што пісьменніца добра выдавалася і мела грошы, дапамагала гродзенцам адбудоўвацца пасля пажараў, купляла ім лекі за свае сродкі.

Януш Паруліс марыць аб тым, каб кожны наведвальнік музея пакідаў яго з жэтонам, на якім адлюстраваны герб Гродна, прычым адбіўшы яго сваімі рукамі. Таму ў бліжэйшых планах — размясціць пры ўваходзе ў музей спецыяльныя прылады для гэтага.

На экспанаты прыходзяць падзівіцца гараджане рознага ўзросту. У музеі ёсць 49 кніг даваеннага часу, выдадзеных у Гродне. Людзі спрабуюць шукаць тут свае карані.

Сярод наведвальнікаў — не толькі беларусы. Заглядваюць госці з Расіі, Англіі, Германіі, Польшчы, Ізраіля. Але ёсць адна акалічнасць. Экскурсія можа адбыцца толькі для 7—8 чалавек, таму што для большай колькасці людзей не хопіць месца.

На ўтрыманне музея Януш Паруліс выдаткоўвае ўласныя сродкі і чакае спонсараў. «Інакш мне давядзецца прадаваць свае экспанаты, каб тут усё давесці да ладу. А гэтага б вельмі не хацелася», — падсумоўвае ён.

Рэчы, якія захоўвае яго музей, распавядаюць і пра самога ўладальніка, асобу цікавую і вядомую. Януш Паруліс размяняў восьмы дзясятак, але грамадскай актыўнасці ў яго можна павучыцца і сёння. Дарэчы, працаваць ён пачаў у 12 гадоў — адразу пасля вайны пайшоў у падмогу да маляроў: спачатку размешваў фарбы, а ўжо потым яму дазволілі фарбаваць. У 14 гадоў хлопчык размалёўваў вялікія плошчы сцен бернардзінскага касцёла ў Гродне. Пасля заканчэння палітэхнікума быў прарабам, майстрам, брыгадзірам. Потым — мастаком у рэкламных майстэрнях. Часу вольнага было шмат: заданне, разлічанае на паўгода, выконваў за месяц, а ўвесь астатні час рамантаваў касцёлы і цэрквы — такіх на яго рахунку 24.

Януш Паруліс ладзіў міжнародныя выставы, прамысловыя і гаспадарчыя, з мастакамі і артыстамі, у Гродне, Калінінградзе, Вільнюсе, Львове. Ёсць яшчэ адна незвычайная старонка ў біяграфіі гэтага чалавека: у свой час ён праходзіў практыку на «Крузенштэрне». Але караблі, на якіх даводзілася плаваць, танулі ажно тры разы. Каб не адбылося чацвёртага падобнага выпадку, ад гэтай справы давялося адмовіцца. Пра любоў да мора гаспадара музея нагадваюць Нептун на сцяне дома, драўляны якар з карчажкі на дзвярах і сапраўдны адміралцейскі — у парозе.

Януш Паруліс — чалавек з цікавым жыццёвым лёсам, які добра ведае гісторыю свайго краю і імкнецца ўсімі сіламі яе захаваць. Сёння ў Гродне няма такога музея, дзе б не выстаўляліся яго экспанаты і каму б ён сам не дапамагаў у арганізацыі экспазіцыі.

Наталля ПАЎЛЮКЕВІЧ.
Фота аўтара.

ДАБРАДАТНЫ АГОНЬ

У вёсцы Данілегі Лельчыцкага раёна захавалася старажытная традыцыя — распальваць у ноч на Вялікдзень вогнішчы як сімвал вечнага жыцця і ачышчэння. Сёлета вяскоўцы зноў сабраліся каля свайго дабрадатнага агню, каб пажадаць адно аднаму і сваёй радзіме доўгага веку і Божага заступніцтва.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

■ Цікавінка з гісторыі

Навошта губернатар... грыміраваўся?

Быў такі віцебскі губернатар, які... накладваў на твар грым, пераапранаўся ў прасталюдзіна і хадзіў па «крымінальных месцах». Рабіў гэта, каб падслухоўваць размовы сладзеяў, якія збіраліся парушыць закон. А іншы губернатар у Віцебску — адзін з двух на ўсю Расійскую імперыю... адмовіўся ад хабару! Дзіўна, што імператар не падзякаваў яму за гэта, а наадварот, чамусьці засумняваўся ў яго лаяльнасці...

Іна АБРАМАВА, гісторык і краязнаўца, ужо больш як 20 гадоў вывучае вельмі цікавую тэму — «Віцебскія губернатары: чыноўнікі і мецэнаты». Вельмі цікавыя факты яна збірае ў архівах, вядзе перапіску з «карыснымі носьбітамі», якія жывуць за мяжой.

Першы фантан — каля губернатарскага палаца

— За час існавання генерал-губернатарства і губернатарства на тэрыторыі сучаснай Віцебшчыны гэтыя пасады займалі 37 персон. Звычайна яны прызначаліся на пасаду на тэрмін не больш як 5 гадоў. Па традыцыі, губернатараў, калі яны, вядома, спраўна служылі, пераводзілі на аналагічныя пасады ў іншыя губерні. Таму не дзіўна, што губернатары да працы ў Віцебску або потым кіравалі ўладай у Сараце, Пскове, іншых гарадах імперыі, — расказвае гісторык.

Яна нагадала, што Віцебск стаў цэнтрам аднайменнай губерні толькі ў 1802 годзе. Цудам да нашых дзён захаваўся палац, дзе жылі і працавалі губернатары.

— Перад тым як расказваць аб губернатарах, безумоўна, трэба ўспомніць гісторыю губернатарскага палаца. Дакладнай даты пачатку яго будаўніцтва я не знайшла. Але можна выказаць здагадку, што гэтая пабудова ў стылі ампір адносіцца да канца XVIII стагоддзя. Першапачатковага плана будынка няма. Затое знайшлося апісанне ў мінскім архіве: дзе і якія пакоі размяшчаліся. Напрыклад, на першым паверсе спачатку было 10 пакояў, а потым 13. Першыя два паверхі — для канцылярыі губернатараў, а трэці паверх — жылыя памяшканні: спальні, дзіцячыя, класны пакой... Прыходзячы на сваю пасаду, многія наваспечаныя губернатары загадвалі рабіць перапланіроўку жылых памяшканняў, каб ім жылося ўтульней... Сярод іншага знайшла і ўнікальную паштоўку — з выявай фантана каля палаца, дарэчы, першага ў горадзе. Былі часы, калі ля губернатарскага палаца кіпела гарадское жыццё — з гуляннямі, выступленнем артыстаў і духавога аркестра. А вось фота, на якім фрагмент таго, як капаюць зямлю для ўстаноўкі насупраць палаца помніка героям вайны 1812 года, — паказвае Іна Абрамава. Помнік, дарэчы, захаваўся да нашых дзён.

У 1917-м у палацы размясціўся камітэт віцебскай арганізацыі РСДРП (б). У гады Лютаўскай рэвалюцыі тут засядаў савет дэпутатаў. (І менавіта таму сквер побач з палацам атрымаў назву Дэпутацкі. Была ў Віцебску і вуліца Дэпутацкая). У гады Вялікай Айчыннай будынак значна пацярпеў. У даведцы аб разбурэнні помнікаў архітэктуры Беларусі гаворыцца, што ад палаца засталіся толькі сцены, а столь і падлога знішчаны. Абсыпалася тынкоўка ўнутраных сцен, знішчаны багатая лепка, скульптурныя ўпрыгажэнні палаца.

Ці вернуць бюсты, зробленыя Шубіным?

Паводле слоў гісторыка, першыя генерал-губернатары ў Віцебску не жылі. І толькі ў 1803 годзе Іван Іванавіч Міхельсон пасяліўся ў палацы. Ён за падаўленне паўстання Пугачова атрымаў невялікі маёнтак недалёка ад Віцебска. Па ўспамінах сучаснікаў, генерал-губернатар быў вельмі добрым чалавекам. Цікава, што вядомы скульптар Шубін зрабіў бюсты генерал-губернатара і яго жонкі. І яны захаваліся да нашых дзён — праўда, не ў Віцебску. Пасля рэвалюцыі ад кіраўніцтва Рускага музея ў Віцебск прыйшоў ліст з просьбай, каб на часовае захоўванне былі адпраўлены тыя творы. Пра гэта ёсць даведка ў Віцебскім абласным архіве. Але бюсты так і не вярнулі. Вядома, што Пушкін, калі працаваў над гісторыяй бунту Пугачова, пісаў пра Міхельсона.



Уладзімір Мікалаевіч Вяроўкін.

Вельмі цікава Іна Абрамава расказвае аб «акупацыйным» генерал-губернатары. У 1812-м Напалеон прызначыў губернатарам маркіза дэ Пастарэ. Малады афіцэр, як і многія французы пры Напалеоне, рабіў кар'еру. Калі стаў губернатарам, спрабаваў ажывіць эканоміку горада. Яго маці была першай французанкай, якая спрыяла з'яўленню сістэмы дашкольнай адукацыі. І ў парыжскім сенаце да гэтага часу можна ўбачыць яе бюст — у якасці ўдзячнасці за тое, што яна зрабіла для Францыі. А сам дэ Пастарэ вядомы сваімі ўспамінамі пра вайну і не толькі.

Іван Сцяпанавіч Жыркевіч у 1836-м стаў губернатарам у Віцебску і на гэтай пасадзе прымаў значны ўдзел у справе далучэння да праваслаўнай царквы ўніятаў. Пасля таго, як выйшаў у адстаўку, у 1838 годзе, заняўся літаратурнай дзейнасцю. Напісаў цікава і пра падзеі вайны 1812 года, у якой браў удзел, вельмі падрабязныя звесткі аб першапачатковай гісторыі ўз'яднання ўніятаў.

Генерал-губернатар Радзішчаў стаў кіраваць губерняй у 1847 годзе і атрымаў усерасійскую вядомасць тым, што падчас праведзенай па волі цара таемнай місіі па дачы хабару ўсім губернатарам, грошы не ўзяў. Як і адзскі губернатар. Астатнія губернатары не адмовіліся ад грошай. Імператар выклікаў Радзішчава да сябе на аўдыенцыю і спытаў: «Зразумела, што адзскі губернатар не ўзяў — у яго і так усё ёсць. А ты чаму не ўзяў?». Проста быў сумленным чалавекам. Можа, таму і пратрымаўся на губернатарскай пасадзе менш за год?

Іна Абрамава.

«Хто? Куды? Навошта?»

Уладзімір Мікалаевіч Вяроўкін, удзельнік Крымскай вайны, у маі 1863 года атрымаў званне генерал-маёра і быў прызначаны віцебскім генерал-губернатарам. І гэтую пасаду займаў да канца 1867 года. Вяроўкін дастойны таго, каб пра яго памяталі, пра што сведчаць многія цікавыя факты з яго губернатарскай дзейнасці. Напрыклад, да яго губернатарства ў Віцебску пастаянна адбываліся вялікія пажары, а прычыну іх ніяк не ўдавалася ўстанавіць. Тады ён запрасіў казакоў навесці парадак. Казакі спынялі сустрэчных, асабліва часта ў начны час, і пыталі: «Хто? Куды? Навошта?» І тых, хто «не ўнушаў даверу», адпраўлялі ў дзяжурную часць. У выніку пажараў хутка больш не было...

— Гэты губернатар заахвочваў гуляшні на губернатарскім бульвары, на якім быў устаноўлены павільён з буфетам. Потым павільён пераўтвораны ў бібліятэку дзіцячага прытулку. У цаглянай Пакроўскай царкве, пабудаванай пад яго патранажам каля старой віцебскай царквы, якая разбурылася, былі абразы, якія напісала або аднавіла яго жонка. Пры яго праўленні асабліва пышна адзначаліся царскія юбілеі, дні каранацыі. Ілюмінацыя падчас тых свят была вельмі шыкоўная. Дагэтуль такога раней не было. Ён пасля службы ў Віцебску быў камендантам Петрапаўлаўскай крэпасці. Там і пахаваны.

У 1867 годзе Павел Паўлавіч Касагоўскі «пераняў губернатарскую эстафету» ў Вяроўкіна. Сучаснікі расказвалі адзін аднаму, што губернатар грыміраваўся і пераапранаўся, каб хадзіць у месцы, дзе збіраліся зладзеі. Прадухіляў такім чынам многія злачынствы. Павел Паўлавіч вельмі актыўна займаўся азеляненнем горада. Ён ініцыяваў будаўніцтва дамбаў цераз віцебскія ручаі... Удзячныя гараджане прысвоілі яму званне «Ганаровы грамадзянін Віцебска». Потым ён у Адэсе працаваў...

Губернатар Растоўцаў быў 13 гадоў на гэтай пасадзе. Па поглядах сваіх лічыўся дэмакратам. Узвёў будынак дваранскага сходу, мужчынскую гімназію, спрыяў тэатру. Мост цераз раку Віцьба загадаў пабудаваць (на яго месцы цяпер знаходзіцца Пушкінскі мост). Царква загадам губернатара была пабудавана пры дзіцячым прытулку. Па яго ініцыятыве былі заснаваны спецыяльныя стыпендыі для гімназістаў і пастаянны тэатр. Гісторык настроены працягнуць сваю даследчыцкую працу. Было б добра, каб была надрукавана кніга пра губернатараў Віцебшчыны. І, безумоўна, быў бы вельмі цікавым тэматычны «губернатарскі» турыстычны маршрут. Дарэчы, па ініцыятыве цяперашняга губернатара Аляксандра Косінца запланавана рэканструкцыя ў скверы каля губернатарскага палаца. У апошнім задумалі размясціць музейную экспазіцыю.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■ Дзеля памяці

ПАЎСТАННЕ Ў ДАКУМЕНТАХ

«Паўстанне 1863—1864 гадоў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях: дакументы і матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі» — так называецца новы зборнік, які нядаўна з'явіўся ў продажы.

Фота Марыі СЦЯПАНАВАЙ.

Зборнік змяшчае больш за 200 арыгінальных дакументаў, якія адлюстроўваюць самыя розныя бакі тых падзей: ход ваенных дзеянняў, правядзенне рэпрэсій супраць удзельнікаў паўстання і людзей, якія ім дапамагалі ці спачувалі (расстрэлы, ссылкі, канфіскацыі), узнагароджванне тых, хто змагаўся супраць паўстанцаў, і іншае. Кніга падзелена на пяць тэматычных блокаў: «Пярэдадзень паўстання», дзе адлюстраваны падзеі, што адбываліся да ўзброенага выступлення; «Віленскае генерал-губернатарства», у якім пададзены дакументы, што тычыліся тых тэрыторый Беларусі, Літвы і частак Польшчы і Расіі, якія былі падначалены Міхаілу Мураўёву. Таксама «Віцебская губерня», «Магілёўская губерня» і «Мінская губерня», якія, у сваю чаргу, падзелены па тэрытарыяльным прынцыпе на падраздзелы і адлюстроўваюць паўстанне ў пэўных паветах.

Дагэтуль дакументы Нацыянальнага гістарычнага архіва, якія адлюстроўваюць гэты перыяд, былі мала ўведзены ў навуковы ўжытак. Многія падзеі заставаліся слаба асветленымі або невядомымі. Дзякуючы гэтаму зборніку на многія спрэчныя пытанні даюцца дакладныя, дакументальна абгрунтаваныя адказы.

Раней лічылася, што ў Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай губернях паўстанне развівалася не вельмі актыўна. Аднак знойдзеныя і апублікаваныя дакументы паказваюць: падзеі паўстання віравалі і тут таксама. Больш за тое, яны мелі сваю выразную спецыфіку ў розных рэгіёнах.

Яшчэ адно клішэ, якое выкарыстоўваецца ў дачыненні да падзей 1863 — 1864 гадоў — гэта тое, што яны персаніфікаваныя, носяць імя Кастуся Каліноўскага і выражаюць памкненні, у асноўным, сялян. Насамрэч паўстанне было ўсеагульным. Не зусім правільна звязваць яго з адной асобай — актыўны ўдзел у ім прымалі многія дваране.

Для зручнасці выкарыстання зборнік змяшчае асабовыя і геаграфічныя паказальнікі, спісы выкарыстаных крыніц і літаратуры, дзе прадстаўлена больш за 300 спраў з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. Складальнік зборніка — загадчык сектара публікацыі дакументаў гэтай установы Зміцер Матвейчык. Кніга атрымалася досыць грунтоўнай дзякуючы архіўным пошукам, якія ён праводзіў некалькі гадоў. Абсалютна да ўсіх адабраных дакументаў Матвейчык змясціў каментарыі.

Сфера інтарэсаў Зміцера Матвейчыка — палітычная гісторыя XIX стагоддзя. Сам ён называе сябе «спецыялістам па паўстаннях». У будучым плануе стварыць «Біяграфічны слоўнік паўстання 1863 — 1864 гадоў» на падставе ўсіх матэрыялаў, якія ёсць у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

СЦІПЛАЯ ЧАРОЎНАСЦЬ ХАЛАДНІКУ

Так у эпічнай паэме «Пан Тадэвуш» (1833 год) апеў улюбёную страву свайго юнацтва, халаднік, славуты паэт Адам Міцкевіч, выхадзец з Навагрудчыны. Халодныя супы, пераважна з агародніны, вядомыя кухням і іншых народаў: іспанскае гаспача, балгарскі таратор, руская «окрошка»...

Як правіла, спачатку яны былі тыпова сялянскімі стравамі. Асабліва запатрабаванымі ў летнюю спёку, калі і есці не асабліва хочацца, і няма часу важдацца з гатаваннем — даць бы рады палявым работам. Прыкладна гэтак жа некалі ўзнік і наш халаднік. «Наш» — гэта літоўскі, беларускі і польскі, таму што за права называць халаднік сваёй стравай спрачаюцца гэтыя тры народы. Хоць спрачацца, па сутнасці, няма аб чым. Калі на халаднік, нарэшце, звярнулі ўвагу гісторыкі і літаратары, яны назвалі яго «халадніком літоўскім». Было гэта на пачатку XIX стагоддзя, і Літву тады разумелі інакш, чым сёння: да яе адносілі не толькі цяперашнюю балцкую Літву, але і добрую чвэрць тэрыторыі сучаснай Беларусі, адкуль літоўская мова ўжо адступіла, а гістарычная памяць яшчэ засталася. Але пісалі гэтыя адукаваныя людзі па-польску, і той піетэт, з якім яны ставіліся да немудрагелістага халоднага супу, паступова перадаўся ўсяму польскамоўнаму свету. Ужо ў першай друкаванай кулінарнай кнізе на нашых землях, «Кухарцы літоўскай» Вінцэнты Завадскай (Вільня, 1854 год), халаднік літоўскі ўпэўнена фігуруе як мясцовы, «краёвы» спецыялітэт. Вось так і стаў халаднік знакавай, амаль сакральнай стравай адразу трох народаў — калі яны вырашылі, што Вялікае Княства Літоўскае «памерла» канчаткова і далей кожны з іх ідзе сваім шляхам.

Кіслы і халодны — вось дзве асноўныя ўласцівасці халадніку, дзякуючы якім ён добра здавальняе не толькі голад, але і смагу. Здаўна яго рабілі на бурачным або хлебным квасе, на адвары шчаўя, на злёгку падкіслых сыроватцы або маслёнцы. Дадавалі перацёртыя або дробна пакрышаныя агуркі (а калі іх яшчэ не было — агурочны пустацвет), зялёную цыбулю, кроп, часам радыску. Салілі і «бялілі» чымсьці малочным, часцей за ўсё смятанай. Паступова самым папулярным стаў менавіта бурачны халаднік. У сучаснай Літве яго завуць халодным баршчом — «шальцібаршчай».

З XIX стагоддзя гэтая тэхналогія паспела зведаць некаторыя істотныя змены. Сёння халаднік вельмі рэдка робяць на бурачным квасе — часцей на астуджаным бурачным адвары, а кіслы смак дасягаецца даданнем воцату або цытрынавай кіслаты. А забельваюць халаднік у Літве часцей за ўсё кефірам, а не смятанай, як даўней. У Беларусі гэты прыём таксама добра вядомы — некаторыя вытворцы нават выпускаюць адмысловы кефір для халадніку, з даданнем агурочнага і кропавага экстрактаў. Але, мабыць, больш папулярная ўсё ж версія на смятане.

Мабыць, самым знакавым варыянтам халадніку трэба лічыць халоднае бацвінне — з астуджанага адвару маладых, памерам з радыску, бурачкоў, разам з бацвіннем. У такім халадніку паходжанне з Вялікага Княства Літоўскага падкрэслена двойчы: па-першае, сам халаднік, бясспрэчна, літоўскі (літоўска-беларускі, удакладняюць сёння); па-другое, бацвінне, у гарачым выглядзе, палякі доўга высмейвалі як бясспрэчны доказ «варварства» літвінаў. Маўляў, толькі свінні і літвіны-«бацвіняжы» здольныя есці бацвінне. Так што яшчэ задоўга да «бульбашоў» і самой бульбы ў беларусаў і літоўцаў ужо была крыўдная мянушка. Але з цягам часу і самі палякі рассмакавалі бацвінне (як гарачае, так і халоднае) уключылі яго ў свой нацыянальны канон. Так што і стымул цвяліць усходніх суседзяў паступова знік, і мянушка забылася.

Міцкевіч не ўдакладняе рэцэпту халадніку свайго юнацтва, але ў яго час у шляхецкі халаднік нярэдка дадавалі халодныя адварныя ракавыя «шыйкі», халодную цяляціну, скрылікі мяса (каплуна або індыка). Такой раскошы, вядома, не ведалі ў сялянскіх хатах. Зрэшты, маглі дазволіць сабе некаторыя празмернасці ў халадніку (напрыклад, сушаную рыбу). А тым больш — варэныя яйкі, якія ў выніку ўвайшлі ў эталонную версію халадніку.

У сучаснай Беларусі другі па распаўсюджанасці пасля бурачнага — шчаўневы халаднік, які часам называюць «смаргонскім». А кампрамісную версію з бурака і шчаўя адначасова — «менскім» халадніком (магчыма, намякаючы на сталую нявызначанасць Мінска, які стагоддзямі балансуе паміж гістарычнымі Літвой і Руссю).

Халаднік і ў Літве і ў Беларусі прынята есці з гарачай варанай бульбай, пасыпанай кропам.

ХАЛАДНІК ПА-МЕНСКУ

Складнікі: *700 г шчаўя, 400 г буракоў, 2 свежыя агуркі, 1 яйка, 2 шклянкі кефіру, 120 г зялёнай цыбулі, 2 ст. лыжкі смятаны, 1 ст. лыжка цукру, соль, кроп.*

Прыгатаванне: *У падсоленай вадзе зварыць прамытае і нарэзанае шчаўе, астудзіць. Асобна зварыць цэлыя буракі, абабраць, накрышыць саломкай, змяшаць са шчаўем, пакласці дробна нарэзаную і расцёртую з соллю і жаўтком зялёную цыбулю, нашаткаваныя свежыя агуркі, здробнены бялок, цукар, узбіты кефір.*

Халаднік заправіць смятанай і пасыпаць дробна нарэзаным кропам.

■ Медыцына дзвюх краін

ПАСТАВІЦЬ ДЗІЦЯ НА НОГІ

У 2015-18 гадах у межах праграмы Саюзнай дзяржавы «Спінальныя сістэмы» Навукова-даследчы дзіцячы артапедычны інстытут імя Г.І. Турнера (г. Пушкін, РФ) і Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр траўматалогіі і артапедыі (г. Мінск) плануюць сумесную навуковую, практычную дзейнасць па аказанні лячэбнай дапамогі дзецям з цяжкімі прыроджанымі дэфармацыямі і пашкоджаннямі пазваночніка. Інстытут імя Генрыха Турнера валодае, па сутнасці, лепшымі тэхналогіямі дыягностыкі, лячэння і рэабілітацыі дзяцей з артапедычнай паталогіяй. Беларускія і расійскія журналісты азнаёміліся з работай буйнога медцэнтра, аснашчанага самым сучасным абсталяваннем. Дарэчы, фінансаванне ўстанове забяспечвае не толькі федэральны бюджэт, але і мецэнаты, напрыклад, дырэктар Эрмітажа Міхаіл Піятроўскі, оперная прыма Ганна Нятрэбка і шэраг іншых.

На фота: 9-гадовы Арцём (у хлопчыка з Арэнбургскай вобласці — дзіцячы цэрабральны параліч) праходзіць рэабілітацыю на робаце-трэнажоры «Лакамат» у кабінеце рухальнай рэабілітацыі.

ПРАЗ НЯСЦЕРПНЫ БОЛЬ

...Каля двух гадоў таму ў Навукова-даследчы дзіцячы артапедычны інстытут імя Г.І. Турнера (расійская федэральная дзяржаўная ўстанова ў Пушкіне, што пад Санкт-Пецярбургам) паступіў другакласнік Рома. У яго адсутнічала частка пятачных касцей ступняў, абедзве ступні «глядзелі» ў адзін бок. У трох клініках урачы прапанавалі ампутацыю. Маці хлопчыка пераконвалі, што гэта адзінае рашэнне, але яна звярнулася ў інстытут імя Г.І. Турнера.

Рому абследавалі, прызначылі аперацыю па ўстаноўцы апарата Ілізарава. Працэс паступовага «падкручвання» выклікаў у хлопчыка такі нясцерпны боль, што ўрач у нейкі момант вырашыў адступіць — ампутаваць ступні. Маці папрасіла рабіць невялікія перадышкі — расцягнуць перыяд «падкручвання». Рома аказаўся неверагодна трывалым. І адночы яго выпісалі, знялі апарат. Рызыка апраўдала сябе! Гэтай вясной Ромка з мамай прыедуць аперыраваць другую нагу...

Інстытут імя Г.І. Турнера называюць унікальнай установай са 150-гадовай гісторыяй. **Тут робяць такія аперацыі, якія не робяць больш нідзе ў свеце, развіваюць найноўшыя навуковыя тэхналогіі і трымаюцца прынцыпаў, закладзеных заснавальнікам — Генрыхам Іванавічам Турнерам (1858-1940).** Ён дабіваўся таго, каб выправіць той ці іншы дэфект, аднак, калі гэта было немагчыма, то ўсяляк садзейнічаў таму, каб наваколькая правільна ставіліся да такога чалавека. Сам Турнер прыгадваў аднойчы, як «аператыўная дапамога раскоўвала зведзеныя канечнасці дзяцей, выпраўляла скрыўленыя косці, паднімала на ногі таго, хто поўзаў, надавала яму чалавечае аблічча». У 1930-я гэта быў фактычна цэнтр барацьбы з дзіцячай інваліднасцю — установа атрымала назву Інстытут аднаўлення працаздольнасці фізічна дэфектыўных дзяцей. І яму было прысвоена імя Турнера (унікальны выпадак прысваення імя пры жывым прафесары).

Вышэйшая хірургічная навука сёння «рэканструюе» дзіця так, што гэта ў разы павышае якасць яго жыцця. Скажам, кароткая нага выцягваецца настолькі, што можна не кульгаць. Калі на руцэ няма пальца, яго перасаджваюць з нагі...

Генрых Іванавіч пашыраў сваю дзейнасць і марыў перавесці інстытут з Санкт-Пецярбурга ў прыгарадную зону, каб забяспечыць сваім пацыентам святло і паветра. У поўнай меры мара Турнера ажыццявілася толькі ў 1960-я, калі ўстанова пераехала ў Пушкін і стала агульнарасійскім цэнтрам лячэння дзяцей з нейра-артапедычнай паталогіяй і рэўматоідным артрытам. **Вось ужо амаль 80 гадоў установа застаецца вядучай ва ўсім, што датычыцца лячэння дзяцей з траўмамі, апёкамі і парушэннямі апорна-рухальнага апарату.**

Сёння інстытут Турнера — гэта 9 аддзяленняў, 500 ложкаў. У самім Пецярбургу дзейнічае яшчэ кансультацыйна-дыягнастычны цэнтр. У бліжэйшых планах — будаўніцтва і адкрыццё асобнага рэабілітацыйнага цэнтра ў самім Пушкіне не менш як на 200 ложкаў. У інстытуце лечацца і пацыенты з самых розных краін СНД. Як за кошт бюджэтных сродкаў, так і па платных паслугах у прыватным парадку. З Беларусі тут — лічаныя пацыенты. Не толькі з-за высокага агульнага кошту такога лячэння (праезд, пражыванне, атрыманне медпаслуг), але і таму, што ў нашай краіне таксама прапануюцца нядрэнныя магчымасці для лячэння артапедычнай паталогіі.

АДЗІН У ПОЛІ НЕ ВОІН

...У падлетка з Сібіры не рухаліся ні рукі, ні ногі. У шаснаццаць гадоў ён мог хіба выкаціцца на ганак свайго дома. За два гады лячэння ў інстытуце Г.І. Турнера хлопец перанёс некалькі аперацый, каб атрымаць шанц аднойчы стаць на ногі. Адначасова ўдалося выправіць і дэфармацыю рук, якімі цяпер можна было карыстацца. Спецыялісты прыгадваюць, як тыдзень хлопец проста стаяў і плакаў — не мог паверыць...

Вышэйшая хірургічная навука сёння «рэканструюе» дзіця так, што гэта ў разы павышае якасць яго жыцця. Скажам, кароткая нага выцягваецца настолькі, што можна не кульгаць. Калі на руцэ няма пальца, яго перасаджваюць з нагі... **Сучасныя хірургічныя тэхналогіі аднаўляюць і страчаныя функцыі, і органы, якія адсутнічаюць.**

Самі хірургі кажуць: сёння мала быць выдатным нейра- ці мікрахірургам. Адзін у полі не воін. Для ратавання хлопчыка, у якога падчас пажару пацярпела 98(!) працэнтаў скуры, у гэтай клініцы аб'ядналіся аднойчы спецыялісты трох краін. З Аўстрыі атрымалі штучны заменнік скуры. Ва Украіне, у лабараторыі культур тканак апёкавага цэнтра Данецка, вырабілі эквівалент спецыяльных клетак. У Пецярбургу, у Інстытуце цыталогіі, сінтэзавалі іншыя жывыя клеткі. Дзякуючы ўсёй гэтай «каперацыі», удалося выратаваць безнадзейна хворага чалавека. За такое ратаванне група ўрачоў была ўдастоена ў 2008-м прэміі лепшым урачам Расіі «Прызванне».

У інстытуце перасаджваюць і пальцы, і нават мышцы з сасудамі ды нервамі. Выконваюцца маніпуляцыі з вельмі дробнымі структурамі, бачнымі толькі пад мікраскопам. На сасуд дыяметрам 1 мм накладваецца да 13 швоў. Шэраг мікрахірургічных аперацый распрацаваны менавіта тут.

У ШЭСЦЬ МЕСЯЦАЎ

Хірургія пазваночніка цалкам выпраўляе дэфармацыю пазваночніка ў немаўлят. Самаму юнаму пацыенту, у якога аперыравалі пазваночнік, было шэсць месяцаў. Пазванкі выпраўляюцца і фіксуюцца з дапамогай імплантатаў. Як толькі пазванкі замацуюцца на патрэбным месцы, канструкцыя выдаляецца.

Паводле слоў **намесніка дырэктара па навуковай рабоце, кіраўніка аддзела паталогіі пазваночніка і нейрахірургіі Навукова-даследчага дзіцячага артапедычнага інстытута імя Г.І. Турнера, доктара медыцынскіх навук, прафесара Сяргея ВІСАРЫЁНАВА,** лячэнне прыроджаных парокаў на раннім этапе — да 3 гадоў — найбольш эфектыўнае. Падобныя аперацыі не выконваюцца больш нідзе ў Расіі. Столькі вузкіх спецыялістаў дзіцячай траўматалогіі і артапедыі сабрана толькі тут.

— З 2000 года ў інстытута наладжана супрацоўніцтва з беларускім Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтрам траўматалогіі і артапедыі, — адзначае доктар Вісарыёнаў. — У беларусаў ёсць большы вопыт па лячэнні траўмаў пазваночніка, у нас — па лячэнні прыроджаных дэфармацый...

У межах Саюзнай праграмы плануецца комплексна даследаваць двухбаковы вопыт, забяспечыць абмен спецыялістамі і пацыентамі. Гэта будзе пашырэнне дыягнастычных магчымасцяў, укараненне новых хірургічных тэхналогій, распрацоўка эксперыментальных спінальных прыстасаванняў. Праграма спінальных сістэм на дзве трэція будзе фінансавацца расійскім бокам, на адну трэць — беларускім.

Святлана БАРЫСЕНКА

■

ДАРОГІ СУСТРЭНУЦЬ ГАСЦІННА

Для абслугоўвання гасцей і ўдзельнікаў чэмпіянату свету па хакеі Мінтрансам распрацавана схема асноўных маршрутаў руху па рэспубліканскіх аўтадарогах. Усяго іх 14: Брэст — Мінск, Бераставіца — Мінск, Брузгі — Гродна — Мінск, Беняконі — Мінск, Каменны Лог — Мінск і іншыя.

Уздоўж рэспубліканскіх аўтадарог устаноўлены знакі з указаннем усіх відаў паслуг, якія аказваюцца на аб'ектах прыдарожнага сэрвісу. Іх паставілі непасрэдна каля з'езду да аб'екта прыдарожнага сэрвісу і загадзя — для своечасовага зніжэння хуткасці. Уладальнікам рэспубліканскіх аўтадарог Мінскай вобласці РУП «Мінскаўтадар-Цэнтр» будуць устаноўлены інфармацыйныя шчыты, якія пакажуць кіроўцам кірунак руху да «Мінск-Арэны» і «Чыжоўкі-Арэны». Дарэчы, аўтадарогам, якія знаходзяцца ў 50-кіламетровай зоне вакол Мінска, надаецца асаблівая ўвага. Работнікі Мінтранса праводзяць выбарачныя праверкі стану дарог, што ўваходзяць у міжнародныя транспартныя калідоры, і дарог, якія вядуць да аўтамабільных пагранпераходаў.

З 1 па 30 мая прадугледжваецца кругласутачная работа спецыяльнай дыспетчарскай службы (дзяжурных).

КАРЫСТАЛЬНІКАМ — НАЛЕЖНЫ СЭРВІС

З мэтай маніторынгу стану аб'ектаў прыдарожнага і дарожнага сэрвісу на рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах з нумерацыяй «М» напярэдадні чэмпіянату свету па хакеі 2014 года і ў адпаведнасці з даручэннем урада створана міжведамасная група.

У кожнай вобласці былі сфарміраваны і пачалі сваю працу групы па ацэнцы адпаведнасці дзейных аб'ектаў патрабаванням, якія прад'яўляюцца да аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу. Так, Міністэрствам транспарту і камунікацый з удзелам зацікаўленых дзяржаўных органаў праведзены маніторынг стану аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу на аўтамабільнай дарозе М-6/Е Мінск — Гродна — мяжа Рэспублікі Польшча (Брузгі) у межах Мінскай вобласці. Спецыялісты Міністэрства гандлю, санітарных службаў і іншых органаў далі ўказанні па выпраўленні хібаў, а таксама рэкамендацыі па павышэнні якасці сэрвіснага абслугоўвання карыстальнікаў дарог. Работа некаторых аб'ектаў грамадскага харчавання часова прыпынена — да выпраўлення парушэнняў. Але ў цэлым адзначана, што кіраўнікамі шэрагу аб'ектаў прынятыя дастатковыя захады для павышэння ўзроўню і якасці абслугоўвання карыстальнікаў дарог.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Нефармат

ЖЫЦЬ ПА СРОДКАХ

Восенню мела неасцярожнасць звязацца з банкам. Нагода была капеечная. Прыехаўшы з дачы, вырашылі з дачкой прайсціся па крамах. Купілі сушылку для фруктаў, а на сокавыціскалку грошай не хапіла. І не столькі тых яблыкаў у нас было, але ж ёй захацелася пакаштаваць свой сок — гэта ж першы наш ураджай. І рэч захацелася купіць адразу. А тут і пільныя супрацоўнікі крамы наляцелі, сталі расхвальваць тавар, прапаноўваць растэрміноўку. Ну мы і вырашылі расцягнуць плацеж на тры месяцы. Растэрміноўка насамрэч аказалася крэдытам банка. Першы раз я пашкадавала, што з ім звязалася, калі ўсё гэта афармлялі. Мяне сфатаграфавалі, перапісалі ўсе звесткі, якія ёсць у пашпарце (потым мы здзіўляемся, адкуль нашы адрасы і тэлефоны з'яўляюцца ў розных сумніўных фірмах), затым удакладнілі велічыню майго заробку, а таксама месца працы мужа і яго заробак, пацікавіліся колькасцю членаў сям'і на ўтрыманні. Можа, і яшчэ што — цяпер не ўспомню.

Выплацілі мы тыя паўтара мільёна за тры разы і забыліся. Але... не забыліся пра нас. На тэлефон і па пошце мне сталі прыходзіць запрашэнні ўзяць крэдыт у названым банку. Потым з банка патэлефанавала прыветлівая дзяўчына і сказала, што ў мяне вельмі добрая крэдытная гісторыя, таму банк гатовы зноў выдаць мне крэдыт. І вось тады ўжо я ветліва папрасіла яе больш не турбаваць, бо я стараюся наогул жыць без крэдытаў.

Можа, я занадта старамодная, але лічу, што крэдыт, у прынцыпе, варта браць толькі на будаўніцтва жылля ці на вучобу, лячэнне. Ва ўсіх іншых выпадках можна абысціся. Хочаш купіць машыну, бытавую тэхніку, электроніку — збірай грошы, паступова адкладвай. Нашы ж людзі нярэдка хочуць усё і адразу. Таму і кормяць цэлую армію тых, хто на гэтым зарабляе. Што ж, кожны свабодны ў сваім выбары. І калі нехта купляе машыну за 30 тысяч еўра ў крэдыт, каб выглядаць паспяховым у вачах знаёмых, а іншы бярэ пазыку на шыкоўны ўласны юбілей, то я нагадала б ім выказванне дасціпнага класіка, які шмат гадоў таму напісаў: «Франт салам боты вымазаў, а скурку з'еў».

Не перашкодзіла б помніць пра «скурку» і некаторым працаўнікам аграрнага сектара. Адзін знаёмы старшыня калгаса скардзіўся: маўляў, дасталі яго банкі са сваімі іскамі на вылік з зарплаты. Механізатары, даяркі, паляводы валам павалілі па крэдыты. Купляюць што трэба і што не. А потым па розных прычынах перастаюць плаціць своечасова. У бухгалтэрыю сельгаспрадпрыемства ідуць выканаўчыя лісты з судоў з патрабаваннем вылічваць працэнт з зарплаты. Калі лік такіх лістоў перавальвае за дзясятак, гэта, згадзіцеся, кавалак работы: падлічыць, вывесці працэнты, зрабіць плацяжы. Работы, якая нікому не патрэбна і нікім не аплачваецца.

Але адна справа — банкі. Цяпер суды завалены іскамі фірмаў, якія на кожным кроку прапануюць хуткія пазыкі. Вось гэта раздолле, асабліва для такога кантынгенту грамадзян, якія не абцяжараюць сябе лішнім роздумам пра жыццё. Часта бяруць грошы пад працэнты не на пакупкі, а проста на выпіўку. А суд потым накладае арышт на маёмасць сям'і. Бо ўсё, што ў хаце, лічыцца агульнай маёмасцю мужа і жонкі. Напэўна, адзіны выпадак за апошні час меў месца ў Брэсце, калі суд адхіліў падобны іск: чалавек па рашэнні суда раней ужо быў абмежаваны ў правах. Значыць, крэдыт без дазволу жонкі ён не меў права браць, але яго дзеяздольнасць ніхто правяраць не падумаў, грошы выдалі. І спаганяць з сям'і даўгі выпівохі не сталі.

Але ж для фірмы падобныя адзінкавыя страты — капейкі. Гэтыя нашчадкі гераіні Дастаеўскага — старой-працэнтшчыцы — робяць грошы з паветра. А ў «паветры» такіх прастакоў, якія здольныя мысліць у адрэзку часу, абмежаваным гадзінай альбо днём, процьма. Не так даўно па тэлевізары адзін пакрыўджаны суайчыннік расказваў, як пазычыў да зарплаты 200 тысяч рублёў, а потым спазніўся з плацяжом на тры дні і быў вымушаны аддаць мільён. Ды і любы крэдыт азначае выкідванне пэўнай сумы ў паветра, з якога хваткія кемлівыя людзі і арганізацыі робяць грошы. Заўважце, цалкам законным спосабам.

Сродак ад гэтага адзін — не лезці ў кабалу, нават невялікую. Вучыцца жыць па сродках. Калі не хапае ад зарплаты да зарплаты, вядзіце асабістую або сямейную бухгалтэрыю, распісвайце расходы. На паперы хутчэй можна вызначыць, якія з расходаў не першачарговыя. Іх можна выключыць са спіса хаця б на бліжэйшы месяц. Бо адзін крэдыт, як правіла, цягне за сабой другі. Магчымасць хуткага атрымання пэўнай сумы грошай становіцца прывычкай, якая зацягвае. І ў выніку ўсё роўна атрымліваецца самападман: грошай і так не хапае, а ты яшчэ добраахвотна нясеш іх нейкаму ўмоўнаму дзядзьку.

...Вы будзеце смяяцца, але пакуль заканчвала пісаць гэтыя нататкі, зноў патэлефанавала супрацоўніца банка і мілым галаском прапанавала мне крэдыт, нейкія «выгадныя для мяне» карткі. Што называецца, іх — у дзверы, яны — у акно. Дзяўчына пачынае завучана: «У вас вельмі добрая крэдытная гісторыя...». Тлумачу ёй, што гэта не крэдытная гісторыя, а гісторыя майго глупства, і прашу больш не турбаваць. Не ведаю, як надоўга яна супакоіцца.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■

Частное унитарное страховое предприятие

«Вартма Иншуранс»

220035, г. Минск, ул. Грибоедова, д. 4, каб. 49, УНП 806000324
Вид деятельности: Добровольное страхование иное, чем страхование жизни.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2014 года

тыс. руб.

АКТИВЫ	Код строки	на 1 января 2014 года	на 31 декабря 2012 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	13 328	18 210
Нематериальные активы	120	7 403	10 548
Доходные вложения в материальные активы	130		
в том числе: инвестиционная недвижимость	131		
предметы финансовой аренды (лизинга)	132		
прочие доходные вложения в материальные активы	133		
Вложения в долгосрочные активы	140		
Долгосрочные финансовые вложения	150		
Долгосрочная дебиторская задолженность	160		
Отложенные налоговые активы	170		
Прочие долгосрочные активы	180		
ИТОГО по разделу I	**190**	**20 731**	**28 758**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	4 037	2 796
в том числе: материалы	211	4 037	2 796
незавершенное производство	212		
прочие запасы	213		
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	215		
Расходы будущих периодов	220	6 028	8 476
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	230		
Доля перестраховщиков в страховых резервах	240	66 686	
в том числе: резерв незаработанной премии	241	59 400	
резервы убытков	242	7 286	
другие технические резервы	243		
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	2 517 643	519
Краткосрочные финансовые вложения	260		
Денежные средства и их эквиваленты	270	23 784 005	15 127 984
Прочие краткосрочные активы	280		
ИТОГО по разделу II	**290**	**26 378 399**	**15 139 775**
БАЛАНС	**300**	**26 399 130**	**15 168 533**

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	на 1 января 2014 года	на 31 декабря 2012 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	7 571 025	7 571 025
Неоплаченная часть уставного капитала	420		
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430		
Резервный капитал	440	6 162 975	4 335 975
в том числе резервный фонд заработной платы	441		
Добавочный капитал	450	6 719	6 719
в том числе прирост (переоценка) стоимости объектов недвижимости, приобретенных за счет страховых резервов	451		
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	3 455 992	1 539 115
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470		
Целевое финансирование	480		
ИТОГО по разделу III	**490**	**17 196 711**	**13 452 834**
IV. СТРАХОВЫЕ РЕЗЕРВЫ И ФОНДЫ			
Резервы по видам страхования, относящимся к страхованию жизни	500		
Резерв незаработанной премии	501	4 571 108	1 170 081
Резервы убытков	502	3 854 355	145 752
Другие технические резервы	503		
Иные страховые резервы	504		
Фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	505	891	130
Гарантийные фонды	506		
Иные фонды, образованные в соответствии с законодательством	507		
ИТОГО по разделу IV	**509**	**8 426 354**	**1 315 963**
V. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510		
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520		
Отложенные налоговые обязательства	530		
Доходы будущих периодов	540		
Резервы предстоящих платежей	550		
Прочие долгосрочные обязательства	560		
ИТОГО по разделу V	**590**		
VI. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610		
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620		
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	776 065	399 736
в том числе: страхователям	631		
страховым агентам и брокерам	632	97 472	46 263
прочим кредиторам по операциям страхования, сострахования	633	517 657	
по операциям перестрахования	634		
депо премий по рискам, переданным в перестрахование	635		
поставщикам и подрядчикам	636	798	5 907
по авансам полученным	637		
по налогам и сборам	638	110 897	313 358
по социальному страхованию и обеспечению	639	12 635	7 862
по оплате труда	640	36 356	26 192
по лизинговым платежам	641		
собственнику имущества (учредителям, участникам)	642		
прочим кредиторам	643	250	154
Обязательства, предназначенные для реализации	650		
Доходы будущих периодов	660		
Резервы предстоящих платежей	670		
Прочие краткосрочные обязательства	**680**		
ИТОГО по разделу VI	**690**	**776 065**	**399 736**
БАЛАНС	**700**	**26 399 130**	**15 168 533**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА ЯНВАРЬ–ДЕКАБРЬ 2013 года

Наименование показателей	Код строки	за январь-декабрь 2013 года	за январь-декабрь 2012 года
1	2	3	4
ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ, ОТНОСЯЩЕМУСЯ К СТРАХОВАНИЮ ЖИЗНИ			
Страховые взносы (страховые премии) полученные, брутто	010		
Страховые выплаты	020		
Изменение резервов по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (+ или -)	030		
Отчисления в гарантийный фонд и фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	040		
Расходы на ведение дела	050		
Доходы и расходы по деятельности, связанной со страхованием, относящимся к страхованию жизни	055		
Прибыль (убыток) от операций по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (строки 010 - 020 + 030 - 040 - 050±055)	060		
ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ ИНОМУ, ЧЕМ СТРАХОВАНИЕ ЖИЗНИ			
Страховые взносы (страховые премии) полученные, брутто - всего	070	9 850 449	3 382 044
в том числе: по прямому страхованию и сострахованию	071	1 166 729	130 208
по рискам, принятым в перестрахование	072	8 683 720	3 251 836
Страховые премии по рискам, переданным в перестрахование, брутто	073	194 282	
Страховые взносы (страховые премии) с учетом перестрахования, нетто (строки 070 - 073)	074	9 656 167	3 382 044
Изменение резерва незаработанной премии, брутто	080	-3 401 027	-1 003 022
Изменение доли перестраховщиков в резерве незаработанной премии	081	59 400	
Изменение резерва незаработанной премии с учетом перестрахования, нетто (итог строк 080 и 081)	082	-3 341 627	-1 003 022
Заработанные премии, нетто (итог строк 074 и 082)	085	6 314 540	2 379 022
Оплаченные убытки (страховые выплаты), брутто	090	116 431	133 108
Доля перестраховщиков в убытках (страховых выплатах)	091		
Оплаченные убытки (страховые выплаты) с учетом перестрахования, нетто (строки 090 - 091)	092	116 431	133 108
Изменение резервов убытков (страховых выплат), брутто	095	-3 708 603	-129 430
Изменение доли перестраховщиков в резервах убытков (страховых выплат)	096	7 286	
Изменение резервов убытков (страховых выплат) с у четом перестрахования, нетто (итог строк 095 и 096)	097	-3 701 317	-129 430
Заработанные премии за вычетом страховых убытков (страховых выплат) (строки 085 - 092 + 097)	100	2 496 792	2 116 484
Изменение других технических резервов	110		
Изменение иных страховых резервов	120		
Отчисления в фонды предупредительных мероприятий и гарантийные фонды	130	761	130
Отчисления в иные фонды, образованные в соответствии с законодательсвом	140		
Расходы на ведение дела, всего	150	1 828 759	679 400
в том числе: комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	151	1 277 006	529 142
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	155	7 771	
Доходы и расходы по деятельности, связанной со страхованием иным, чем страхование жизни	160	589 088	4 099
Прибыль (убыток) от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (строки 100 + 110 + 120 - 130 - 140 - 150 + 155 ± 160)	170	1 264 131	1 441 053
Доходы по инвестиционной деятельности	180	1 420 781	957 378
в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	181		
доходы от участия в уставном капитале других организаций	182		
проценты к получению	183	1 420 781	957 378
прочие доходы по инвестиционной деятельности	184		
Расходы по инвестиционной деятельности	190		
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	191		
прочие расходы по инвестиционной деятельности	192		
Доходы по финансовой деятельности	200	3 719 493	1 213 883
в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	201	2 269 237	1 213 883
прочие доходы по финансовой деятельности	202	1 450 256	
Расходы по финансовой деятельности	210	3 306 304	1 102 772
в том числе: проценты к уплате	211		
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	212	1 852 804	1 102 772
прочие расходы по финансовой деятельности	213	1 453 500	
Иные доходы и расходы	220	-623 566	-586 683
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (строки 180 - 190 + 200 - 210 ± 220)	230	1 210 404	481 806
Прибыль (убыток) отчетного периода (строки ± 060 ± 170 ± 230)	240	2 474 535	1 922 859
Налог на прибыль	250	557 658	451 717
Изменение отложенных налоговых активов	260		
Изменение отложенных налоговых обязательств	270		
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	280		
Чистая прибыль (убыток) (строки ± 240 - 250 ± 260 ± 270 - 280)	290	1 916 877	1 471 142
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	300		
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	310		
Совокупная прибыль (убыток) (строки ± 290 ± 300 ± 310)	320	1 916 877	1 471 142
Базовая прибыль (убыток) на акцию	330		
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	340		

Руководитель Слук И.В.

Главный бухгалтер Воронович Л.Д.

Достоверность баланса подтверждена аудиторским обществом с дополнительной ответственностью «ГлобалАудит», зарегистрированным решением Минского горисполкома за № 1708 от 22.09.2005 г.

Результаты проведенной проверки за 2013 год показывают, что отчетность Частного предприятия «Вартма Иншуранс» сформирована в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение Частного предприятия «Вартма Иншуранс» на 1 января 2014 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2013 год, при этом совершенные Частным предприятием «Вартма Иншуранс» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

zepter bank

Закрытое акционерное общество «Цептер Банк»

Адрес: 220034, г. Минск, ул. Платонова, 1Б

эл. адрес: info@zepterbank.by.

Тел.: 331 89 49, факс 331 89 48

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2014	01.04.2013
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	22 107,5	18 943,1
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	45 381,3	38 541,5
5	Средства в банках	1104	57 430,3	18 018,6
6	Ценные бумаги	1105	101 767,0	132 054,9
7	Кредиты клиентам	1106	328 915,7	284 085,0
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	35 525,5	29 188,4
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	-	-
12	Прочие активы	1111	3 338,1	4 849,5
13	ИТОГО активы	11	594 465,4	525 681,0
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
15	Средства Национального банка	1201	7 877,9	7 758,3
16	Средства банков	1202	39 507,7	22 811,2
17	Средства клиентов	1203	223 573,7	201 280,5
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	27 450,6	31 776,1
19	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
20	Прочие обязательства	1206	7 302,2	4 363,8
21	ВСЕГО обязательства	120	305 712,1	267 989,9
22	**КАПИТАЛ**			
23	Уставный фонд	1211	149 487,0	149 487,0
24	Эмиссионный доход	1212	-	-
25	Резервный фонд	1213	8 571,3	7 474,4
26	Фонд переоценки статей баланса	1214	26 460,5	20 898,3
27	Накопленная прибыль	1215	104 234,5	79 831,4
28	ВСЕГО капитал	121	288 753,3	257 691,1
29	ИТОГО обязательства и капитал	12	594 465,4	525 681,0

Председатель Правления Миронов Илья Борисович

Главный бухгалтер Михалевич Оксана Владимировна

Дата подписания «03» апреля 2014 г.

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2014	01.04.2013
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	17 478,9	17 117,1
2	Процентные расходы	2012	7 448,0	10 254,0
3	Чистые процентные доходы	201	10 030,9	6 863,1
4	Комиссионные доходы	2021	2 072,5	2 187,3
5	Комиссионные расходы	2022	324,2	235,0
6	Чистые комиссионные доходы	202	1 748,3	1 952,3
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	728,8	(506,1)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	8 046,6	1 782,0
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	(5,4)	-
11	Чистые отчисления в резервы	207	4 146,6	(375,6)
12	Прочие доходы	208	223,3	109,3
13	Операционные расходы	209	8 872,4	7 250,0
14	Прочие расходы	210	414,1	313,0
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	7 339,4	3 013,2
16	Налог на прибыль	212	1 043,3	277,6
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	6 296,1	2 735,6

Председатель Правления Миронов Илья Борисович

Главный бухгалтер Михалевич Оксана Владимировна

Дата подписания «03» апреля 2014 г.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 31 от 28.05.2013 на осуществление банковской деятельности. УНП 807000214.

■ Гасцёўня «Звязды»

«ВЕРА БЕЗ РОЗУМУ І РОЗУМ БЕЗ ВЕРЫ НЕМАГЧЫМЫЯ»

У Гомель філосаф і багаслоў Аляксандр Філоненка «заляцеў» на некалькі дзён па запрашэнні браціі Свята-Мікольскага мужчынскага манастыра. Тут паспеў сустрэцца са студэнтамі ГДУ імя Ф. Скарыны і епархіяльных біблейска-багаслоўскіх курсаў, паўдзельнічаў у праваслаўнай радыёпраграме «Ключ разумення» і пагутарыў аб актуальных праблемах праваслаўнай Царквы і грамадства з карэспандэнтам газеты «Звязда».

Аляксандр Сямёнавіч у свой час з поспехам скончыў фізіка-тэхнічны факультэт Харкаўскага ўніверсітэта па спецыяльнасці «эксперыментальная ядзерная фізіка», але кандыдацкую дысертацыю абараніў па філасофскай антрапалогіі, а вядомасць набыў як багаслоў. І таму першае пытанне пра тое, чым быў матываваны пераход ад ядзернай фізікі да філасофіі і хрысціянскага багаслоўя?

— Вы ведаеце, тое, што часам здаецца парывам, скокам ад фізікі да філасофіі, ад філасофіі да багаслоўя, насамрэч пражываецца як бесперапынная, лагічна звязаная гісторыя, якую цяжка каментаваць... У дзяцінстве я адкрыў у сабе моцнае жаданне займацца фізікай і матэматыкай, потым, калі паступіў ва ўніверсітэт, вырашыў стаць прафесіяналам у гэтай справе. Але праз нейкі час з жахам зразумеў, што ў маіх навуковых занятках ужо няма той любові, няма таго здзіўлення і хвалявання, якія я адчуваў у школьныя гады. І вось гэты смутак пра страту стаў для мяне лёсавызначальным. Па розных прычынах, але я здагадаўся, што менавіта філасофія ёсць тая справа, якая дазваляе чалавеку вярнуць сабе першую любоў да свету. Яна дае нам здольнасць вечна здзіўляцца, задаваць пытанні, і значыць — быць жывымі! А з багаслоўем было яшчэ цікавей. У перыяд «перабудовы» раптам высветлілася, што існуе невядомы савецкім людзям свет — руская рэлігійная філасофія. Для мяне спачатку гэта было нязвыкла — даведацца, што ёсць строгая, сістэматычная, рацыянальная думка пра Бога. Але дзякуючы філосафам айцу Паўлу Фларэнскаму, Сямёну Людвігавічу Франку, часткова Мікалаю Бярдзяеву я, нарэшце, зразумеў, што супрацьпастаўленне веры і розуму — гэта каласальная памылка, звязаная з тым, што людзі вельмі вузка разумеюць розум і вельмі лжыва разумеюць веру. Насамрэч, калі разабрацца, вера без розуму і розум без веры немагчымыя!

— Вы з'яўляецеся вучнем вядомага мітрапаліта Антонія Суражскага (Блума). Многія людзі кажуць, што ўладыку, які памёр больш за 10 гадоў таму, сёння можна назваць святым чалавекам. Вы як лічыце?

— Відавочна, што дзякуючы сустрэчам з мітрапалітам Антоніем многія тысячы людзей набылі вопыт веры. Ён заўсёды казаў, што ніводзін чалавек на зямлі не можа сустрэць царства нябеснае, не сустрэўшы яго водбліска ў вачах іншага чалавека. Такім чалавекам для многіх і быў мітрапаліт Антоній. Вядома, пытанне кананізацыі — гэта пытанне царкоўнага сведчання і царкоўнага настаўніцтва. Я ўпэўнены, што ён быў выдатным сведкам Хрыста. Многія яго ведалі па тых візітах, якія ён ажыццяўляў, пачынаючы з 1962 года, у Савецкі Саюз. Ва ўмовах, калі пропаведзь была немагчымая, ён быў адзіным епіскапам, які мог свабодна гаварыць. І сустрэчы, якія тады адбываліся ў храмах, на кватэрах, у гатэлях ці проста на вуліцы, для многіх сталі лёсавызначальнымі. Я прыйшоў у царкву пазней, у канцы 80-х гадоў. Тады ўладыка Антоній казаў, што самыя складаныя гады, якія нас чакаюць — гэта гады, калі галоўным пытаннем стане — наколькі мы вартыя, здольныя быць адэкватнымі сведкамі таго подзвігу новапакутнікаў, які адбыўся ў нашай царкве ў XX стагоддзі.

Вядома, што ў Брытаніі ледзь не знікла валійская мова. І тады ў краіне разгарнулі праграму выратавання мовы, вялізную дзяржаўную адукацыйную падтрымку, у тым ліку абавязковае вывучэнне яе ў школе.

— А чым, на ваш погляд, вопыт новапакутнікаў — людзей, якія не страцілі веру, не адракліся ад Хрыста ў дастаткова цяжкіх умовах свайго жыцця, можа быць карысны сёння?

— Прыняцце вопыту новапакутнікаў для сучаснага верніка з'яўляецца вырашальным крытэрыем таго, наколькі жыццяздольная наша вера. За апошнія 25 гадоў Царква кананізавала 1700 новапакутнікаў. Гэта амаль у 6 разоў больш, чым да пачатку XX стагоддзя (316). Ёсць такая версія разумення абяцання Хрыста, які гаворыць: «Я ствару Царкву Маю, і вароты пекла не адолеюць яе». Сіла сведчання Хрыста такая, што нават у пекле мы бачым Яго святло. Я думаю, што менавіта такі вопыт здарыўся ў XX стагоддзі. Калі ўсім людзям на зямлі здавалася, што справа Царквы — толькі выжыць, яна змагла не толькі абараняцца, але і сведчыць у гэтых абставінах. І гэтае святло веры пранікала нават у такія куткі чалавечага існавання, якія складана ўявіць. І кожны новапакутнік ставіць перад намі пытанне: адкуль у яго бралася сіла такога сведчання? Наколькі мы здольныя ў мірныя часіны далучыцца да гэтага сведчання, наколькі наша жыццё можа быць тым святлом, якое пранікае ў пекла?

— Беларусаў сёння вельмі хвалюе тая сітуацыя, якая складаецца ва Украіне. Занадта мы блізкія, шмат у нас там сваякоў... Ці магчыма пераадолець супрацьстаянне, якое сёння адбываецца ў вашай краіне?

— У Царквы ёсць адна задача ў гэтым свеце — быць сведкамі таго міру, які прынёс Хрыстос. Людзі па слабасці сваёй мірам завуць стан пасля вайны, але гэта не мір. Гэта стан грамадства, якое думае па законах вайны. Магчыма, самае важнае і каштоўнае, што хрысціяне змаглі б у такім грамадстве, дзе ёсць падзеленасць і межы — прынесці мір, звязаны з малітвай і са сведчаннем пра Хрыста. І паказаць, што магчыма іншае жыццё. Украінскія падзеі можна вельмі парознаму ацэньваць, мне не хацелася б даваць палітычных ацэнак. Царква можа ва ўкраінскім грамадстве быць той сілай, якая забяспечвае міратворчую дзейнасць. Гэта важна для любога грамадства — каб прарастаў мір, пабудаваны не толькі на перамір'і, бяспецы і стабільнасці, але і пабудаваны па правілах дружбы і любові. І гэта заклік Царквы.

— З моманту распаду Саюза прайшло больш за 20 гадоў, за гэты час кожная краіна прайшла свой шлях. Як вы лічыце, магчымасці ўзаемадзеяння ў нас застаюцца?

— Калі паглядзець на гэту сітуацыю ў хрысціянскім кантэксце, трэба ўспомніць словы прападобнага Максіма-вызнаўцы пра тое, што Бог стварыў свет разнастайным. Але людзі па граху сваім адрозненне ператвараюць у падзел. Сапраўды, Бог не стварае аднастайнае і простае. Таму Ён увесь свет засяліў рознымі народамі — і гэта добра. Адрозненне — гэта Божае багацце і сведчанне багацця. Але людзі ўмеюць ператвараць гэтыя адрозненні ў падзел, і так нараджаецца зло. Для мяне багаццем з'яўляецца тое, што славянскі свет уяўляе такую разнастайнасць: культур, падыходаў, жыццёвых досведаў. Катастрофа, калі паміж гэтымі досведамі праводзяцца межы і яны супрацьпастаўляюцца адзін аднаму. Як хрысціяне мы можам супрацьпаставіць гэтай падзеленасці магчымасць стасункаў, шануючы адрозасць досведу, бачачы плён гэтых адрозненняў, гэтага шляху.

— Як праваслаўная Царква можа ставіцца да «досведу» разбурэння сямейных каштоўнасцяў у сучасным свеце?

— Відавочна, класічная сям'я разбураецца, але мы загадзя прайграем, калі будзем толькі папярэджваць грамадства аб наступствах яе страты. Ёсць куды больш плённы шлях. Важна паказаць свету прывабнасць і прыгажосць хрысціянскай сям'і. Хрысціянства прынесла ў інстытут сям'і пэўную евангельскую навізну, прывабнасць. І самі хрысціяне павінны адказваць, што для іх гэта навізна значыць.

Бог стварыў свет разнастайным. Але людзі па граху сваім адрозненне ператвараюць у падзел.

— Цікава ведаць вашу ацэнку такой з'явы, як знікненне мовы. Для нас, беларусаў, гэта вельмі актуальна.

— Мне здаецца, усяму свету зразумела, што мовы трэба выратоўваць. Больш за тое, ёсць дакладныя крытэрыі, па якіх зразумела, што мова знаходзіцца ў небяспечным становішчы і можа хутка знікнуць. Памяншаецца колькасць людзей, якія размаўляюць і пішуць на мове. Потым застаюцца людзі, якія не пішуць, але размаўляюць. А потым іх дзеці, якія разумеюць — але ўжо не размаўляюць. Працэнтныя суадносіны гэтых груп у пакаленнях лінгвістамі ацэньваюцца як сітуацыя небяспекі для мовы. Дарэчы, вядома, што ў Брытаніі ледзь не знікла валійская мова. І тады ў краіне разгарнулі праграму выратавання мовы, вялізную дзяржаўную адукацыйную падтрымку, у тым ліку абавязковае вывучэнне яе ў школе. І цяпер ёсць універсітэты, дзе выкладаюць на валійскай. Мова такім чынам была выведзена з крызіснага становішча і выратавана.

— Але ж многія лічаць, што не трэба нічога навязваць штучна, людзі самі разбяруцца, на якой мове даваць адукацыю дзецям...

— А тут як і з сям'ёй. Можна развіваць панічны настрой і лямантаваць: мы страчваем мову! Але гэта нікому не дапамагае. Адзіны спосаб захаваць мову — рабіць на ёй нешта такое, што стане прывабным для іншых. Калі культура жыццяздольная, зусім не важна, якога яна памеру. Гэта можа быць і тры, і сто, і тысяча носьбітаў. Культура павінна быць жывой і нараджаць шэдэўры. Людзі, якія любяць, ведаюць і цэняць мову, павінны самі сведчыць, што ў іх нацыянальнай культуры ёсць неверагодная прыгажосць — іх мова. І паказваць гэтую прыгажосць. Заўсёды знойдуцца людзі, якія будуць рабіць гэта па любові.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара ■

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Дацэнт кафедры тэорыі культуры і філасофіі навукі філасофскага факультэта Харкаўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя В.Н. Каразіна не абмяжоўваецца выкладаннем толькі ў сваёй установе. Ён друкуе артыкулы ў праваслаўных часопісах, з'яўляецца выкладчыкам Маскоўскага, Мінскага і Кіеўскага летніх багаслоўскіх інстытутаў, ладзіць агульныя праекты з італьянскімі праваслаўнымі вернікамі. Ён — лаўрэат прэміі фонду Джона Тэмплтана за курс лекцый «Навука і багаслоўе», удзельнічаў у даследчых праектах брытанскай акадэміі, галандскага Каталіцкага ўніверсітэта, чытаў лекцыі ў Біблейска-багаслоўскім інстытуце імя св. апостала Андрэя, на багаслоўскім факультэце Кембрыджскага ўніверсітэта, Інстытуце рэлігійных навук імя св. Фамы Аквінскага ў Кіеве...

КОНКУРС ДЛЯ МАЛАДЫХ НАВУКОЎЦАЎ

Аб'яўлены рэспубліканскі конкурс для назначэння стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным на 2015 год

Указам Прэзідэнта заснаваны 100 стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным, якія працуюць у арганізацыях, што займаюцца навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі ў галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, сацыяльных і гуманітарных навук. Стыпендыі прызначаюцца тэрмінам на адзін каляндарны год у памеры, які ўстанаўліваецца Прэзідэнтам на падставе прапаноў спецыяльна створанай Міжведамаснай камісіі.

Для ўдзелу ў конкурсе вылучаюцца кандыдатуры, якія дасягнулі найлепшых вынікаў у навуковай, навукова-тэхнічнай інавацыйнай дзейнасці. Пры гэтым дактары навук павінны быць ва ўзросце да 45 гадоў, кандыдаты навук — да 35 гадоў, вучоныя без ступені — да 30 гадоў на 1 студзеня года, у якім ажыццяўляецца вылучэнне.

Вылучаюць кандыдатуры арганізацыі па асноўным месцы працы таленавітага маладога вучонага, на сходзе навуковых работнікаў або навукова-тэхнічным (вучоным) савеце на падставе рэкамендацыі калектыву работнікаў структурнага падраздзялення, дзе ён працуе.

Арганізацыі, якія рэкамендуюць кандыдатуры для прызначэння стыпендый, прадстаўляюць па кожнай з іх хадайніцтва.

Дакументы прадстаўляюцца **да 1 ліпеня 2014 года** ў Нацыянальную акадэмію навук Беларусі — па кандыдатурах, рэкамендаваных арганізацыямі акадэміі; у Міністэрства адукацыі Беларусі — па кандыдатурах, рэкамендаваных установамі вышэйшай адукацыі; у Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Беларусі — па кандыдатурах, рэкамендаваных іншымі арганізацыямі, якія займаюцца навуковымі даследаваннямі і распрацоўкамі.

Стыпендыі не назначаюцца маладым навукоўцам, якім у папярэднія пяць гадоў, уключаючы год, у якім ажыццяўляецца вылучэнне для ўдзелу ў конкурсе, прызначаліся стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым навукоўцам; тым, каму на год прызначэння стыпендыі прадастаўляюцца гранты ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта ад 13 верасня 2013 года № 425; тым, каму на працягу трох гадоў, што папярэднічалі году прызначэння стыпендыі, прызначаліся іншыя стыпендыі Прэзідэнта, за выключэннем стыпендый і грантаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, таленавітай моладзі.

З поўнай інфармацыяй аб парадку правядзення конкурсу, умовах, устаноўленых для дасягненняў таленавітых маладых вучоных, пералікам прадстаўляемых дакументаў можна азнаёміцца на сайце Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь **http://gknt.org.by**

Святлана БУСЬКО.

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2. Телефон для справок: 120

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2014 год	2013 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		418 989,6	375 568,8
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		9 448,8	15 233,3
4	Средства в Национальном банке	1103		2 249 525,0	1 578 785,3
5	Средства в банках	1104		1 122 280,2	783 008,2
6	Ценные бумаги	1105		1 665 696,3	821 848,9
7	Кредиты клиентам	1106		9 339 231,8	5 739 081,6
8	Производные финансовые активы	1107		847 562,8	703 342,5
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		147,6	147,6
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		489 993,5	336 724,1
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		-	228,5
12	Прочие активы	1111		146 767,0	101 942,4
13	**Итого активы**	**11**		**16 289 642,6**	**10 455 911,2**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201		325 350,5	320 088,7
16	Средства банков	1202		3 968 089,8	1 479 737,8
17	Средства клиентов	1203		8 673 415,0	5 919 052,6
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		641 874,9	525 300,4
19	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
20	Прочие обязательства	1206		124 323,9	219 121,0
21	Всего обязательства	120		13 733 054,1	8 463 300,5
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211		1 252 268,8	1 252 268,8
24	Эмиссионный доход	1212		-	-
25	Резервный фонд	1213		280 901,9	231 235,6
26	Фонд переоценки статей баланса	1214		217 975,3	176 490,4
27	Накопленная прибыль	1215		805 442,5	332 615,9
28	Всего капитал	121		2 556 588,5	1 992 610,7
29	**Итого обязательства и капитал**	**12**		**16 289 642,6**	**10 455 911,2**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2014 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2014 год	2013 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		482 238,4	309 910,2
2	Процентные расходы	2012		246 299,5	144 301,6
3	*Чистые процентные доходы*	201		235 938,9	165 608,6
4	Комиссионные доходы	2021		97 803,2	67 458,5
5	Комиссионные расходы	2022		39 047,9	24 594,4
6	*Чистые комиссионные доходы*	202		58 755,3	42 864,1
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		630,2	123,2
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		3 956,3	22 298,5
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		3 563,1	12 702,2
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		22 267,8	42 613,6
11	Чистые отчисления в резервы	207		30 449,2	22 986,5
12	Прочие доходы	208		106 893,9	8 477,4
13	Операционные расходы	209		136 159,8	105 565,6
14	Прочие расходы	210		12 994,1	19 652,0
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		252 402,4	146 483,5
16	Налог на прибыль	212		36 158,0	22 560,0
17	**Прибыль (убыток)**	**2**		**216 244,4**	**123 923,5**

Председатель правления В.Д.Бабарико

Главный бухгалтер Т.М.Пивовар

Дата подписания: 4 апреля 2014 г.

Данная отчетность опубликова на сайте ОАО «Белгазпромбанк» **www.belgazprombank.by** в разделе «Финансовые показатели»

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 выдана Национальным банком Республики Беларусь 24.05.2013. УНП 100429079

■ Май на ўвазе!

НА ЧЫГУНАЧНЫЯ ПЕРАВОЗКІ ПАСАЖЫРАЎ — СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ ТАРЫФЫ

Беларуская чыгунка і ААТ «Расійская чыгунка» ўводзяць спецыяльныя тарыфы на перавозку пасажыраў асобнымі цягнікамі ў зносінах Беларусь — Расія. Яны будуць дзейнічаць цягам сёлетняга года — з 1 чэрвеня. Мэтай новаўвядзення з'яўляецца павышэнне прыцягальнасці пасажырскіх перавозак.

У міжнародных пасажырскіх цягніках № 4/3 Брэст — Масква фарміравання Беларускай чыгункі і № 7/8 Масква — Брэст фарміравання ААТ «Федэральная пасажырская кампанія» ў залежнасці ад тэрмінаў продажу да агульнага кошту праезду па тэрыторыі Расіі і Беларусі ў вагонах усіх тыпаў, за выключэннем агульных, будуць устанаўлівацца спецыяльныя тарыфныя ўмовы. 15-працэнтная зніжка да агульнага кошту праезду (білет на ўвесь маршрут следавання і плацкарта) — пры ўмове продажу праязных дакументаў у перыяд ад 60 да 31 сутак да адпраўлення цягніка. 10-працэнтная зніжка — пры ўмове продажу білетаў у перыяд ад 30 да 21 сутак да адпраўлення цягніка. Пры ўмове продажу праязных дакументаў у перыяд ад 20 да 11 сутак да адпраўлення цягніка зніжак не прадугледжана, а пры ўмове продажу праязных дакументаў за 10 сутак і менш да адпраўлення цягніка ўстанаўліваецца 5-працэнтная надбаўка да агульнага кошту праезду, патлумачылі ў прэс-службе магістралі.

Указаныя зніжкі і надбаўка не будуць дзейнічаць да кошту праезду на тэрыторыі Беларусі і кошту плацкарты ў вагоны фарміравання Беларускай чыгункі для наступных дат: 31.10 — 10.11; 25.12 — 31.12; па тэрыторыі Расіі і да кошту плацкарты ў вагоны фарміравання ААТ «Федэральная пасажырская кампанія» для наступных дат: 31.10 — 04.11; 25.12 — 31.12.

Напрыклад, кошт праезду 1 чэрвеня ў цягніку № 4/3 Брэст — Масква ў купэйным вагоне па маршруце Мінск — Масква складае 1 243 000 рублёў (па стане на 1 красавіка); у выпадку аплаты праезду да 31 сутак і больш да адпраўлення цягніка кошт праезду са зніжкай 15 працэнтаў складзе 1 058 000 рублёў.

Акрамя таго, устанаўліваецца зніжка ў памеры 10 працэнтаў ад агульнага кошту праезду пры адначасовым афармленні праязных дакументаў у напрамку туды-назад для праезду ў вагонах СВ і купэйных вагонах фарміравання Беларускай чыгункі № 96/95 (да 1 чэрвеня — № 196/195) Брэст — Масква і № 26/25 Мінск — Масква. Так, кошт праезду 1 чэрвеня ў цягніку № 26/25 Мінск — Масква ў купэйным вагоне ў адным напрамку складзе 1 243 000 рублёў, а пры аплаце праезду туды-назад кошт праезду ў адным напрамку складзе 1 119 700 рублёў.

Пры гэтым вяртанне праязных дакументаў, афармленых па спецыяльным тарыфе для праезду туды-назад ажыццяўляецца пры адначасовым прад'яўленні двух праязных дакументаў, афармленых у абодва бакі. Вяртанне праязнога дакумента, не выкарыстанага ў адзін бок, а таксама частковае вяртанне праязных дакументаў, афармленых са зніжкай на праезд туды-назад, не праводзіцца.

У залежнасці ад размяшчэння месцаў павялічваецца розніца ў кошце праезду ў плацкартных вагонах цягнікоў № 4/3 Брэст — Масква; № 26/25 Мінск — Масква; № 96/95 Брэст — Масква фарміравання Беларускай чыгункі і цягніка № 7/8 Масква — Брэст фарміравання ААТ «Федэральная пасажырская кампанія». Білеты на бакавыя паліцы плацкартных вагонаў названых цягнікоў будуць каштаваць менш. Напрыклад, кошт праезду 1 чэрвеня ў цягніку № 26/25 Мінск — Масква ў плацкартным вагоне на не бакавых месцах складзе 674 700 рублёў, на бакавых месцах са зніжкай 10 працэнтаў — 608 300 рублёў.

Зніжкі, якія даюцца ў залежнасці ад размяшчэння месцаў у плацкартных вагонах, суміруюцца са зніжкамі ў залежнасці ад тэрмінаў продажу і зніжкай «туды-назад».

Указаныя тарыфныя ўмовы прымяняюцца пры праездзе ў міжнародных зносінах паміж Беларуссю і Расіяй і не дзейнічаюць пры афармленні праязных дакументаў у межах Беларусі, а таксама пры перавозцы арганізаваных груп пасажыраў.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ Акцыя

«НАША ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА»

Віцебск стаў адным з гарадоў, які сустракаў удзельнікаў міжнароднага аўтапрабегу «Наша Вялікая Перамога». Акцыя на колах прысвечана чарговай гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і юбілею вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Каля дваццаці ўдзельнікаў аўтапрабегу на віцебскай плошчы Перамогі ўсклалі кветкі да Вечнага агню. Яны сустрэліся з кіраўніцтвам вертыкалі ўлады, прадстаўнікамі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, навучэнцамі.

— Мы вязём другі ў свеце па сваіх памерах аналаг Сцяга Перамогі, які ў 1945 годзе быў узняты над рэйхстагам. Плошча сцяга — 200 квадратных метраў. Вось ужо ў трэці раз ён перавозіцца па краінах былога СССР. Летась мы праехалі больш як 90 гарадоў Расіі, Украіны, Беларусі, Казахстана, Малдовы, Паўднёвай Асеціі. Сёлета на маршруце іх больш як 70, — паведаміў журналістам Алег Слюсарэнка, каардынатар праекта, крымскі журналіст.

Паводле яго слоў, стартаваў прабег у Севастопалі. Сярод іншых гарадоў на маршруце — Мінск, Орша, Магілёў, Смаленск, Мурманск, Масква. Фінішуе калона аўтамабілістаў напярэдадні свята Перамогі. Усе ахвотныя могуць далучыцца да калоны, каб частку маршруту праехаць разам. Гэта зрабілі і некаторыя жыхары Віцебска.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

Фота Аляксей СПАТКАЯ.

■ Спорт-тайм

«ДЫНАМА» ВЫЙШЛА НА ПЕРШАЕ МЕСЦА

У тыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра другую запар буйную перамогу БАТЭ, рэванш хакейнай зборнай і поспехі беларускіх гімнастаў.

У «гараджан» так і не атрымалася паразіць вароты «бела-сініх».

Фота Тараса ШЧЫРАГА.

1. Пасля чацвёртага тура футбольнага чэмпіянату краіны вызначыўся аднаасобны лідар — мінскае «Дынама». Праўда, пераважна гэта залежала ад выніку матча «Нафтан» — «Шахцёр». Палачане і салігорцы згулялі ўнічыю 1:1 і прапусцілі наперад «бела-сініх», якія ў сталічным дэрбі перайгралі ФК «Мінск» — 2:0. З такім жа лікам скончылася і сустрэча жодзінскага «Тарпеда» з брэсцкім «Дынама». Тры ачкі на свой рахунак запісалі падапечныя Ігара Крывушэнкі. Упарты характар прадэманстраваў навічок вышэйшай лігі — «Слуцк», які з мінімальным лікам прайграў «Гомелю». У сярэдзіне другога тайма адзіны гол у матчы забіў Павел Сітко. Складаным атрымаўся паядынак паміж «Дняпром» і «Неманам» (2:3). На 86-й хвіліне вырашальны мяч у вароты магіляўчан забіў літоўскі навабранец «жоўта-зялёных» Эдгар Масцяніца.

Але самую буйную перамогу ў чацвёртым раўндзе атрымала БАТЭ. З лікам 5:2 «жоўта-сінія» перайгралі трыумфатара мінулага тыдня бабруйскую «Белшыну». У складзе барысаўчан дублем адзначыўся Міхаіл Гардзяйчук, які, дарэчы, яшчэ ў мінулым сезоне гуляў за бабруйскі клуб. Нягледзячы на ўнушальны вынік, галоўны трэнер БАТЭ Аляксандр Ермаковіч знайшоў за што пакрытыкаваць сваіх падапечных: «Перамогай над добрым сапернікам задаволены. Рады, што вылучыліся нашы форварды. Але ёсць і мінусы: прапусцілі два галы, адзін з якіх — зноў са «стандарту». Ды і пасля выдалення перасталі гуляць. Такога быць не павінна. Усё-такі гуляем для балельшчыкаў, на хатнім стадыёне».

2. Зборная Беларусі па хакей ўзяла рэванш у швейцарцаў за паражэнне ў першым таварыскім матчы. Пасля паражэння ў першым спарынгу з лікам 2:5 падапечныя Глена Хэнлана больш надзейна згулялі ў абароне. А ў серыі паслядматчавых булітаў сваё майстэрства прадэманстраваў самы вопытны галкіпер беларускай зборнай Андрэй Мезін, які адбіў усе тры шайбы. Перамогу ж нашай камандзе прынёс Аляксей Калюжны, які закінуў вырашальны буліт і зрабіў лік 2:1. Наступную серыю таварыскіх матчаў нацыянальная зборная правядзе 24 і 26 красавіка ў Даніі, а напярэдадні чэмпіянату свету згуляе з датчанамі на хатняй арэне.

3. З чатырма медалямі вяртаюцца ***беларускія гімнасты з этапа Кубка свету,*** які праходзіў у славенскай Любляне. У апорным скачку «золата» заваяваў Павел Булаўскі. У практыкаванні на брусах — «серабро» ў Анастасіі Якіменкі. І дзве «бронзы» на рахунку Васіля Міхаліцына (практыкаванне на кані) і Аляксандра Царэвіча (практыкаванне на перакладзіне). Адзначым, што гэты турнір стаў апошнім этапам падрыхтоўкі да чэмпіянату Еўропы, які праз тры тыдні стартуе ў Сафіі.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

■

СВЕТЛЫ ЗАРАНАК «ЗАРЫ»

Так выглядае новы жывёлагадоўчы комплекс у Махнавічах.

Услынным саўгасе-камбінаце «Зара», што на Мазыршчыне, не былі ўсяго тры гады, а навін там сабралася багата! Створанае і выпешчанае сённяшнім губернатарам Гомельшчыны Уладзімірам Дворнікам на руінах невялікага свінакомплексу шляхам яго імклівай інтэнсіфікацыі і далучэння некалькіх стратных гаспадарак, гэтае знакамітае зараз прадпрыемства з'яўляецца адным з найбольш эфектыўных у Беларусі.

І пастаянна здзіўляе наватарскім падыходам да тэхналогій жывёлагадоўлі, смеласцю ў асваенні новых гарызонтаў, а яшчэ — шчырымі, таленавітымі людзьмі. І галоўнае пытанне, якое мы задавалі ім зараз — што за гэты час з'явілася новага, вартага ўвагі?

Пасля Махнавічаў — Нароўля

Каб пагутарыць з дырэктарам, Алегам Слінько, давялося між іншых спраў чакаць амаль да васямнаццаці гадзін вечара. У гэты дзень праходзілі сесіі Гомельскага абласнога і Мазырскага раённага Саветаў, і Алег Міхайлавіч прымаў удзел у іх рабоце. Нягледзячы на тое, што з самага ранку і макавай расінкі не было ў роце, на сустрэчу з журналістамі «Звязды» ўсё ж прыехаў, за што мы яму шчыра ўдзячныя.

— За гэтыя гады мы на месцы не стаялі, развіваліся, і, калі абагульняць, то можна сказаць, што рэалізоўвалі тыя планы і задумкі, якія выношваў яшчэ Уладзімір Андрэевіч Дворнік, ствараючы гэтую буйную гаспадарку. У яго планах было і павелічэнне плошчаў зямельных угоддзяў, каб цалкам забяспечыць сябе прадукцыяй раслінаводства для стварэння трывалай кармавой базы. Менавіта таму ў 2009 годзе была далучана трэцяя па ліку адстаючая гаспадарка на правах аддзялення — Махнавічы. А ў самым канцы мінулага года ўзялі ў арэнду яшчэ 2 тысячы гектараў зямлі ў суседнім Нараўлянскім раёне. Такім чынам, плошчы сельскагаспадарчых угоддзяў перавысілі 8 тысяч гектараў.

Дырэктар саўгаса-камбіната «Зара» Алег Слінько.

Новаму аддзяленню ў Махнавічах удзялілі вельмі вялікую ўвагу, актыўна займаліся там развіццём раслінаводства. А ў 2011 годзе пабудавалі і новую малочнатаварную ферму, па сутнасці — комплекс на 600 кароў, і ў 2012 годзе пачалі даіць. Сёлета, нават у бліжэйшыя месяцы, комплекс цалкам запоўнім. Адразу не запаўнялі, бо засяляем новыя сцены толькі высокапрадукцыйнай жывёлай — часткова сваёй, што называецца, гадоўлі, і частку набывалі за межамі гаспадаркі. Сёння тут сабраны вельмі нават нядрэнны статак па селекцыі (што журналісты «Звязды» ахвотна пацвярджаюць, бо бачылі на ўласныя вочы і адкрыта любаваліся гэтым статкам. — **Аўт.**), атрымліваем там сяреднясутачны надой звыш 22 літраў малака. Новая ферма ўжо дае каля 12 тон малака за суткі.

Пад гэты комплекс стварылі летась ферму для гадавання цялушак на 600 галоў, сёлета завяршаем там усе работы. Што дазволіць не толькі забяспечваць сябе добрым маладняком, але і рэалізоўваць яго за межы гаспадаркі. У лютым прадалі першых гадаванцаў, зараз рыхтуем наступную партыю. Вы ведаеце, што сёння тэма гадоўлі і рэалізацыі цялушак для айчыннай жывёлагадоўлі надзвычай актуальная. І калі рэнтабельнасць вытворчасці малака ў гаспадарках — каля 30 працэнтаў, то рэалізацыя цялушак дазваляе атрымаць рэнтабельнасць у разы большую. Гэта значыць, калі закупачная цана маладняку буйной рагатай жывёлы на мясакамбінатах 24 тысячы за кілаграм разам з НДС, то цялушак сёння можна прадаць і за 70 тысяч. Прыкіньце самі: за сваіх 20 цялушак мы ўтаргавалі прыкладна 700 мільёнаў. Так што гэта адзін з рэальных шляхоў умацавання фінансавага дабрабыту гаспадаркі.

Таксама ў Махнавічах ужо два гады закладваем сад: у 2012 годзе пасадзілі 20 гектараў і столькі ж — летась. А ўсяго агульная плошча разам з кустамі чорных парэчак складзе 100 гектараў. Цікава тое, што і тут прыменім перадавыя тэхналогіі. Кантроль за працэсам росту дрэў і кустарнікаў возьмуць на сябе камп'ютары, будзе дзейнічаць сістэма кропельнага паліву і аўтаматычнай дазаванай падачы ўгнаенняў. Гэта таксама было яшчэ задумана Уладзімірам Андрэевічам Дворнікам — стварыць там высокапрадукцыйны сад. Тым больш што ў нас развіты ўласны фірмовы гандаль, і праблем з рэалізацыяй быць не павінна. А частку ўраджаю будзем перапрацоўваць. Сёлета разлічваем зняць першы ўраджай яблыкаў. І першыя яблыкі абавязкова накіруем сваім работнікам на натураплату, якая шырока развіта ў нашай гаспадарцы, людзі атрымліваюць яе рэгулярна.

За гэтыя гады ўкаранілі сістэму бяспекі вытворчасці прадуктаў харчавання ХАССП. Зараз знаходзімся на палове шляху да стварэння сістэмы ICO 22000. Пройдзе нейкі час, і мы ўкаранім яе цалкам. Пераабсталявалі, мадэрнізавалі цэх забою жывёлы і цэх перапрацоўкі — каб прадукцыя цалкам адпавядала патрабаванням Еўрастандарту і Санпіну. Адным словам, імкнуліся захаваць і ўдасканаліць тую структуру гаспадаркі, пры якой усё кампактна, а затраты, наколькі гэта магчыма, мінімальныя. У тым ліку на вытворчасць прадукцыі, абагрэў будынкаў і гэтак далей. А эфект ад гаспадарання — па магчымасці максімальны. Вось у гэтым кірунку мы і рухаліся.

Пабудавалі яшчэ адзін птушнік на птушкафабрыцы. І ўсе гэтыя гады нарошчвалі як вытворчыя, так і эканамічныя паказчыкі. За мінулы год рэалізавалі звыш 11 тысяч тон мяса (у ваш мінулы прыезд марылі пра 10 тысяч тон), атрымалі 6 тысяч 420 тон малака і больш за 55 мільёнаў яек. Важным лічым і тое, што перапрацавалі ўсё самі і практычна ўсё прадалі праз сетку свайго фірмовага гандлю. Так што сістэма наша працуе, калектыў толькі павялічваецца, ствараюцца новыя працоўныя месцы. Сёння ў саўгасе-камбінаце налічваецца звыш 1300 чалавек, сярэдняя зарплата па гаспадарцы, з улікам натураплаты, наблізілася да 7 мільёнаў рублёў. Гэта значыць, толькі працуй і зарабляй, павышай дабрабыт сваёй сям'і. Невыпадкова існуе чарга ахвотных уладкавацца да нас на працу.

— Пасля мадэрнізацыі цэха перапрацоўкі ці пашырыўся асартымент яго прадукцыі? Некалі было 62 віды каўбасных вырабаў, з іх 40 вэнджаных і 70 паўфабрыкатаў. Не так і мала для нестолічнага, скажам так, перапрацоўчага прадпрыемства.

— Калі глядзець па прэйскуранце, то відаў прадукцыі тут ужо звыш 180. Гэта разам з кулінарыяй. Пакупнік сёння патрабавальны, таму на месцы таксама не стаім. Тэхналагі пастаянна працуюць над стварэннем новых відаў прадукцыі, з высокімі смакавымі і наогул спажывецкімі, якаснымі паказчыкамі. І стараемся абавязкова падтрымліваць на належным узроўні якасць тых відаў прадукцыі, выпуск якіх асвоілі раней. Бо многія з іх — брэндавыя, «зароўскія», іх рэйтынг устойліва трымаецца на высокай планцы некалькі гадоў, і пакупнік прыходзіць у фірмовыя магазіны «Зары» менавіта па іх. Тры апошнія гады ўдзельнічалі ў конкурсе «Густ» разам з буйнымі мясакамбінатамі, у выніку многія віды нашай прадукцыі выйшлі пераможцамі прафесійнага конкурсу. Лічу, што цалкам заслужана тры гады запар за стабільна высокую якасць нашых вырабаў, укараненне новых тэхналогій і шырокі асартымент прадукцыі «Зара» ўзнагароджвалася дыпломам «Залаты густ». І надалей будзем працаваць так, каб было не сорамна перад пакупніком.

— Свінагадоўля па-ранейшаму — ваш магістральны напрамак?

— Так, трымаем амаль 40 тысяч галоў свіней, і менавіта ў гэтай галіне летась дабіліся аднаго з самых высокіх паказчыкаў рэнтабельнасці — звыш 25 працэнтаў. За мінулы год рэалізавалі 7650 тон свініны. У апошнія месяцы назіраецца станоўчая кан'юнктура цэн на яе, і я спадзяюся, што па сакавіку рэнтабельнасць перавысіць 30 працэнтаў, бо адпускная цана павялічылася на 15-20 працэнтаў. Хоць летась адчуваліся пэўныя праблемы са збытам, свініна не была асабліва запатрабавана, даводзілася часам зніжацца ў цане. Таму што вытворчы цыкл у нас бесперапынны, і трэба пастаянна вызваляць месца на адкорме для наступнага пагалоўя.

— Вы сказалі, што ўсю сваю прадукцыю рэалізуеце праз фірмовую сетку. Сам па сабе гэта паказальны факт. Колькі ў вас крам?

— Фірмовых крам зараз 22, а ўсіх гандлёвых пунктаў каля 30-ці, калі ўлічваць рынкі, міні-рынкі, павільёны. Гэтымі днямі ўзялі ў арэнду невялікі магазін у мікрараёне Зарэчны,там пражывае прыкладна 10 тысяч мазыран, і з іх боку былі просьбы ў выканкам, каб адкрылі менавіта «зароўскі» магазін. Так што мы пайшлі насустрач пажаданням людзей.

Цяпер вядзём рэканструкцыю 11-га магазіна ў Мазыры. Думаем, што паспеем адкрыць да Дня незалежнасці. Прынамсі, такую мэту паставілі перад будаўнікамі.

І гатовы ўжо праект крамы ў гарадскім пасёлку Лельчыцы. Гэта рэгіён, які развіваецца дастаткова хутка, ва ўсялякім разе, у Гомельскай вобласці ён лідзіруе па аб'ёмах індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва, нават без прыцягнення банкаўскіх крэдытаў. Стала вядома, што ў хуткім часе там будзе пракладзена чыгунка. Думаем, наша фірмовая крама, з шырокім асартыментам, будзе запатрабавана. Ужо ездзілі выбіраць месца, размаўлялі з кіраўніком раёна. Там нас чакаюць.

— Вядома, што далейшае развіццё любога калектыву немагчыма без інвестыцый, першым чынам у вытворчасць...

— Інвестуем толькі ўласныя сродкі, якія зарабляем самі, у пазыкі не залазім. У 2012 годзе атрымалі пад 80 мільярдаў рублёў чыстага прыбытку, у асноўным усе іх і накіравалі на развіццё гаспадаркі. Летась інвеставалі яшчэ амаль 50 мільярдаў. Так што за два апошнія гады накіравалі на развіццё больш за 100 мільярдаў. Усё гэта дазваляе ўзводзіць новыя жывёлагадоўчыя комплексы і фермы, а справа, самі разумееце, не танная. Напрыклад, за апошні час пабудавалі 8 новых карпусоў для ўтрымання жывёлы, з добраўпарадкаваннем, і абышліся яны ў 20 мільярдаў.

Укладзеныя сродкі, безумоўна, будуць апраўданы. Мы ўдала пачалі новы гаспадарчы год. Выручка ў першым квартале складае за месяц больш за 40 мільярдаў, штодня ў казну гаспадаркі паступае 1 мільярд 300 — 1 мільярд 400 мільёнаў рублёў. За два першыя месяцы атрымалі чыстага прыбытку каля 12 мільярдаў рублёў. Так што сродкі на далейшае развіццё павінны быць.

Прыемна, што паралельна з намі развіваюцца і іншыя гаспадаркі раёна. Мы пабудавалі ферму, пра якую я вам расказваў, і адначасова ў раёне было пабудавана яшчэ пяць такіх фермаў, зараз яны пачынаюць даваць аддачу. Наогул, Мазырскі раён — адзін з лідараў у вобласці і рэспубліцы па шчыльнасці жывёлы на 100 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў, ды і па іншых параметрах.

— У «Зары» дзейнічае цэлая сістэма заахвочвання за старанную працу. Раскажыце пра яе.

— Гэта сістэма матэрыяльнага стымулявання за канчатковы вынік. Напрыклад, механізатары атрымліваюць адчувальныя даплаты за якасць сяўбы — да 50 працэнтаў, па выніках усходаў. Калі адсеяліся і ўсё ўзышло, ствараецца спецыяльная камісія, аб'язджае аддзяленні. Глядзяць, якой была апрацоўка глебы, ці няма агрэхаў, як глеба падкормлена, ці раўнамерна ўгнаенні ўнесены і г.д. Калі ўсё выдатна — атрымлівайце да 50 працэнтаў даплаты. А па атрыманым ураджаі — яшчэ па акладзе.

Такія ж выплаты ў аператараў на комплексе і ў спецыялістаў у раслінаводстве і жывёлагадоўлі. Гэтую дзейсную сістэму прадумаў і стварыў на многія гады Уладзімір Андрэевіч Дворнік, і яна, як бачыце, працуе.

Птушыныя... пяшчотнасці

Як вядома, існуюць «цялячыя пяшчотнасці». А вось **начальнік участка птушкагадоўлі «Зары» Ніна Мішота** пераканала нас у тым, што існуюць і... курыныя. Але спачатку пагаварылі з ёю пра вынікі працы.

— Мы ўжо ведаем, што за мінулы год вы атрымалі больш за 55 мільёнаў яек.

— Па 338 на адну курыцу-нясушку. І дабіліся 2208 тон валавой прывагі бройлераў пры сярэднясутачнай прывазе 56 грамаў.

— Памятаецца, вы ставілі перад сабой задачу атрымаць 2000 тон мяса бройлераў...

— Значыць, ставілі тады цалкам рэалістычныя мэты, і ўсё атрымалася. За апошні час пабудавалі і ўвялі ў строй птушнік на 65 тысяч галоў. Цяпер у нас шэсць птушнікаў для курэй-нясушак. Ёсць магчымасці для гадоўлі рамонтнага маладняку. І ўжо ёсць не толькі халадзільнік, але і склад, які дазваляе адправіць яйкі ў гандаль расфасаванымі, чыстымі, прамаркіраванымі.

Што датычыць бройлернай вытворчасці, то на бройлернай пляцоўцы — 6 залаў, птушка паступае тры разы на месяц. Сутачных куранят завозім пакуль з Польшчы, але на перспектыву вызначыліся, што ў далейшым будзем працаваць з гомельскай кампаніяй.

Абсталяванне ў нас усё сучаснае, новае. Раней пастаўшчыком клетачнага абсталявання было ўкраінскае прадпрыемства «Тэхна», а на апошні птушнік паставілі абсталяванне «Калядзічы-Агра», з імі збіраемся супрацоўнічаць і ў перспектыве.

У аснове ўсёй работы ляжыць зніжэнне расходаў на вытворчасць, у тым ліку электраэнергіі. Але 70 працэнтаў у структуры затрат займаюць камбікармы, і важна звесці да мінімуму непрадукцыйныя расходы. У кармушкі павінна трапляць роўна столькі, колькі неабходна па абгрунтаваных нормах. У «Зары» свой камбікормавы завод, тым не менш эканоміць трэба.

Калі паступае чарговая партыя куранят, мы павінны стварыць для іх усе ўмовы, каб яны раслі і развіваліся. Шмат што залежыць ад даглядчыка — уключыць ці выключыць лішнія лямпачкі, спыніць рухавікі, каб не было непатрэбнага шуму.

Намеснік дырэктара па раслінаводстве Міхаіл Слінько пазнаёміў нас з ходам веснавых работ на меліяраваных палях.

Нават навучыць свайго падапечнага своечасова прачнуцца, своечасова паесці (не забывайце, што гэта сутачнае куранё). Птушняцы іх і будзяць, і прымушаюць харчавацца: кожную гадзіну праходзяць па радах і «ўгаворваюць». Бо за сем дзён трэба «разбіць» яго страўнічак, далей яно будзе ўжо само. За 40 дзён мы павінны нарасціць тушку да 2 кілаграмаў 450 грамаў.

І яшчэ адна задача — захаваць пагалоўе. Калі куранятка слабенькае — адсадзіць у ізалятар, падпаіць яго, наогул падмацаваць. На капрызлівай бройлернай вытворчасці, нягледзячы на тое, што займацца ёю пачалі не так даўно, захаванасць складае 96 працэнтаў. Гэта нядрэнны паказчык.

— І хто больш за іншых клапоціцца пра сваіх гадаванцаў?

— Ведаеце, трасуцца над імі ўсе, бо калі не любіць сваю работу, не атрымаеш і вынікаў. А вось лідзіруюць зусім канкрэтныя людзі. Па нясушачнай вытворчасці наперадзе звяно птушкаводаў Валянціны Аляксеевай, у якое таксама ўваходзяць Ганна Казлова і аператар Мікалай Захарыч. За мінулы год у іх самы лепшы паказчык — далі 14 мільёнаў яек, а прадукцыйнасць на адну галаву склала 347 яек (па фабрыцы, вы памятаеце, 338).

На бройлернай вытворчасці лепшае звяно Алы Верамеевай і Сяргея Бабовіча. Яны атрымалі за год 378 тон валавой прывагі, сярэднясутачная прывага склала 58 грамаў.

Да гэтых паказчыкаў вельмі шчыльна набліжаюцца астатнія, і рашэнне аб пераможцах прымаецца з улікам захаванасці пагалоўя, расходу кармоў і іншых важных параметраў.

Так што ўсё стала лепш, чым вы бачылі ў 2010 годзе, калі былі ў нас апошні раз. Усё ўстаялася.

У элітгаса добрая слава

Галоўны аграном Андрэй Турук расказвае:

— Дзякуючы той сістэме земляробства, якую мы прымяняем, няўхільна расце ўрадлівасць глебы, у прыватнасці, павялічваецца колькасць гумусу. Мінулай восенню мы адчулі, што становіцца цеснавата на нашых шасці тысячах гектараў, бо павялічылася патрэба ў кармах, каб належным чынам накарміць статкі. Таму і ўзялі ў арэнду яшчэ і палеткі ў суседнім Нараўлянскім раёне. Тэхніка, якую маем, дазваляе спраўляцца з узрослымі аб'ёмамі, кадры механізатараў — таксама.

Сеем збожжавыя і зернебабовыя, яравыя і азімыя. Але асноўная культура — кукуруза: 2500 гектараў тут, у «Зары», на зерне і на сілас. І 700 гектараў на зерне пасадзім на арандаваных плошчах. А што датычыць ураджайнасці, то да гэтага штогод атрымлівалі кукурузы на зерне каля 100 цэнтнераў з кожнага гектара вільготнасцю ад 35 працэнтаў. Маглі б атрымліваць зерня і больш, але расце пагалоўе буйной рагатай жывёлы, і патрэбен сілас.

Як выкарыстоўваем? Частка кукурузнага зерня, каля 7 тысяч тон, сушыцца і ідзе на камбікармы для жывёлы і птушкі. А частку плюшчым з дапамогай дзвюх чэшскіх плюшчылак і ўкладваем у рукавы з тоўстага пластыку, а потым усю зіму кормім свіней на адкорме. Зерне кансервуем з дапамогай біялагічнага кансерванту, створанага на аснове малочна-кіслых бактэрый. Такое кансерваванае зерне здольна захоўвацца да новага ўраджаю. Жывёла есць яго вельмі ахвотна. І калі камбікармы сёння каштуюць больш за 2 мільёны за тону, то кансерваваная кукуруза, не менш спажыўная, каля 1 мільёна. На кожнай тоне эканомім мільён.

Вельмі важная акалічнасць: кукуруза на зерне пакідае пасля сябе на полі ад 15 да 20 тон лісцёва-сцябловай масы. У працэсе ўборкі яна здрабняецца і застаецца на полі, заворваецца ў верхні слой глебы. І асноўны прырост гумусу — за яе кошт. Так што гэтая культура для нас яшчэ і меліярант, які паляпшае якасць ворнага гарызонту.

Паколькі «Зара» з'яўляецца элітгасам, то азімае жыта, азімае трыцікале і яравое трыцікале — гэта ўсё пасевы на насенне. Зараз манціруем міні-завод па перапрацоўцы насення, у яго ўкладзена 9 мільярдаў беларускіх рублёў. Манціруе фірма «Полымя», яшчэ тыдні два работы, і мы зможам давесці сваё насенне да ДАСТаў, прапанаваць пакупнікам (а гэта, перш за ўсё, гаспадаркі вобласці) не толькі высокай рэпрадукцыі, цудоўнай якасці, але і пратручаным і ўпакаваным.

Вяртанне каралевы

Тэму эфектыўнага гаспадарання на зямлі працягвае **Міхаіл Слінько, намеснік дырэктара па раслінаводстве.**

— Калі каментаваць вынікі мінулага года, пра што вы просіце, то варта сказаць з самага пачатку: год выдаўся няпростым з-за кліматычных умоў, быў засушлівым, гэта ўсе памятаюць. Але калі браць па паказчыках, то спрацавалі ўвогуле нядрэнна. Галоўным я лічу тое, што з гектара сельскагаспадарчых угоддзяў атрымалі 63 цэнтнеры кармавых адзінак. І сабралі з гектара 7150 тон каласавых (хоць у 2012 годзе было 8 тысяч тон).

Кукурузы па ўраджайнасці ўзялі свае 98,5 цэнтнера, як і ў 2012 годзе. Вал у «каралевы палёў» мог быць і большым, але пашырылі плошчы пад сілас у сувязі з ростам колькасці буйной рагатай жывёлы: выйшлі амаль на 3,5 тысячы галоў. Таму заклалі на 6 тысяч тон сіласу больш. Увогуле, адпрацавалі дастойна, я лічу.

Ёсць база, каб у будучым павышаць ураджайнасць. Патрэбна толькі ўстараніць недахоп вільгаці ў глебе, які асабліва адчуваецца на азімых. Дабіцца, каб запрацавала належным чынам меліярацыя з двайным рэгуляваннем. У сувязі з гэтым на 2015 год запланавана карэнная рэканструкцыя меліяраваных сістэм «Зары», якія былі закладзены раней. А пакуль вядзём паэтапна іх рэканструкцыю, па 300-400 гектараў у год. І ранняй вясной стараемся закрыць вільгаць у глебе, а дзе-нідзе на каналах самі дадаткова прыбудоўваем плаціны, каб «падхарчавацца» вільгаццю.

Аб перспектывах гаспадаркі мы клапоцімся ўсур'ёз, таму працуем і над гібрыдамі сваёй найбольш прыбытковай культуры — кукурузы, выпрабоўваем іх дастаткова вялікую колькасць. У севааброце штогод высяваем 15-16 гібрыдаў — на адным не зацыкліваемся, бо не варта забываць, што ў нас зона рызыкоўнага земляробства. І нешта можа быць лепш, а нешта — і горш. Тое ж самае і са збожжавымі: маем гатункі і заходняй селекцыі, але ўпор робім на беларускія. Мінулы год паказаў, што айчынныя гатункі аказаліся больш устойлівымі падчас зімоўкі.

У агульную скарбонку ўнёсак раслінаводчай галіны даволі сур'ёзны. Вырашаем пастаўленую перад намі галоўную задачу — забяспечыць жывёлу кармамі. Калі браць разліковы прыбытак, то ў пераводзе на грошы атрымаецца прыкладна 18 мільярдаў. Але агаворымся, што ўвесь наш прыбытак паступае праз жывёлагадоўлю.

Начальнік участка птушкагадоўлі Ніна Мішота ў птушніку №5.

За ліняй для сартавання яек птушкавод Жанна Шульга і аператар Юрый Скідан.



У Мазыры магазін «Дары ад «Зары» на вуліцы Пралетарскай папулярны сярод жыхароў. На здымку: загадчыца Тамара Бараноўская, прадаўцы Наталля Рэут і Валянціна Мажэйка.

Бачым свае рэзервы. Хоць тэхналогія атрымання прадукцыі раслінаводства за многія гады адладжана, усё ж у шэрагу выпадкаў можна працаваць і лепш, асабліва ў плане выкарыстання тэхнікі, у тым ліку яе перамяшчэнняў, каб эканоміць дарагое паліва. Набываем сучасныя, найчасцей камбінаваныя агрэгаты, каб менш рабіць праходаў па полі. У гэтым годзе ўзялі энерганасычаны трактар «Кіравец К-744», які намнога таннейшы, больш просты і нават больш надзейны ў абслугоўванні, чым замежныя аналагі. А таксама дзве высокапрадукцыйныя сеялкі і агрэгат для апрацоўкі глебы. Ураджайнасць палеткаў імкнёмся павышаць і арганікай — больш уносім угнаенняў на палі з меншай урадлівасцю, каб выраўняць аддачу. Пакуль жа паміж участкамі існуе істотная розніца — асабліва на тых, гаспадарамі якіх мы сталі параўнальна нядаўна.

Узнятая цаліна Махнавічаў

Анатоль Ляшкевіч у мінулым працаваў аграномам у гэтым аддзяленні, цяпер яго ўзначальвае.

— Махнавічы былі далучаны да «Зары» ў 2008 годзе, а раней тут быў даволі стратны саўгас «Прамень Кастрычніка», — распавядае Анатоль Канстанцінавіч. — «Зара» ўклала ў асваенне новых для сябе зямель салідныя сродкі. Купілі і накіравалі сюды новую тэхніку, з дапамогай якой перавярнулі ўсю зямлю, унеслі дастаткова гербіцыдаў, наогул навялі парадак. І ўжо ў 2009 годзе атрымалі нармальны ўраджай.

Гэта было зроблена дзякуючы як мясцоваму касяку механізатараў, так і механізатарам 1-га і 2-га аддзяленняў. Хлопцы працавалі з 6 гадзін раніцы і да 9-10 вечара, нягледзячы на тое, што з Барбарова, напрыклад, ім трэба было ездзіць штодня за 70 кіламетраў. Значыць, выехаць у 5 гадзін раніцы (а ўстаць у 4), і легчы ў поўнач. Гэта быў самы звычайны гераізм людзей, якім патрэбна было падняць цаліну, бо зямля — вельмі запушчаная. Нават угнаенні не ўносіліся, хоць яны і былі. Проста ляжалі горы ўгнаенняў, якія гублялі сваю прадуктыўнасць пад дажджамі і снегам. Не было тэхнікі, не было рабочых рук, зарплату не плацілі, адсутнічала належная арганізацыя. Асноўным даходам мясцовага насельніцтва заставаўся збор ягад і грыбоў. Калі прынялі гаспадарку, яна налічвала 48 чалавек. А потым людзі паглядзелі, што справы пайшлі нармальна, і вярнуліся — хто з лясгаса, хто з горада. Нехта нават у Расію ездзіў на заробкі, а цяпер палічыў, што дома ён заробіць не менш.

Так што сёння ёсць і рабочыя рукі (больш за 100 працаўнікоў), і тэхніка, і перадавыя тэхналогіі, і належная зарплата. Люба-дорага глядзець, як працуюць людзі, тыя ж механізатары. Бадай што, наша аддзяленне сёння — самае моцнае. Тры нашы экіпажы механізатараў летась трапілі нават на абласныя «Дажынкі», бо працуюць з высокімі паказчыкамі. 60 працэнтаў збожжа і кукурузы «Зара» атрымала з Махнавічаў. Летась раслінаводства ў аддзяленні дало 9,5 мільярда прыбытку,

Раней не было сваёй жывёлагадоўлі, што з'яўлялася істотным недахопам. Сёння працуе вось гэтая сучасная ферма, на якой мы з вамі знаходзімся. Яна ўжо прынесла 1,5 мільярда прыбытку. Надой на карову — 22,8 кілаграма, рэнтабельнасць — 26 працэнтаў. Малако даім толькі класам «экстра», таварнасць складае 93 працэнты. Стаіць гомельская «Ёлачка», якая працуе з ізраільскай электронікай. Даяркі ўсе мясцовыя. Нармальная працоўная і санітарная дысцыпліна. На кожнай дойцы прысутнічае спецыяліст.

І ёсць яшчэ адна ферма ў Дзярбінках. Агульнае пагалоўе — 1240 галоў. Значыць, маем уласную арганіку, можна паляпшаць урадлівасць глебы.

Пачалі будаваць склад для мінеральных угнаенняў. На яго патрэбны два з паловай мільярды рублёў. Заасфальтавалі мехдвор, узвялі навес для тэхнікі, пабудуем у Дзярбінках летні лагер для адкорму бычкоў.

Клапоцімся і пра людзей. У гэтым годзе здалі 8 домікаў, ключы атрымалі 8 сем'яў механізатараў і даярак, якія прыехалі да нас працаваць. Калі жыллё патрэбна некаму з мясцовых жыхароў, якія ў асноўным жыллём забяспечаны, ставім на чаргу і выдзяляем. Вёска павінна жыць.

Матэрыял падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

Ад рэдакцыі. ***Выказваем шчырую падзяку намесніку дырэктара па ідэалагічнай рабоце Іне Хамутоўскай за дапамогу ў падрыхтоўцы гэтай публікацыі.***

УНП 400408726

Лічбы і факты

Пераможцамі прафесійнага конкурсу «Густ» у сваіх намінацыях у апошні час сталі:

прадукт фірмовы з свініны вараны мясны вяндліна «Волатаўская» і вяндліна «Волатаўская» ў натуральнай абалонцы;

каўбаса паўвэнджаная «Святочная» і каўбаса вараная «Купалінка»;

каўбаса сыравэнджаная «Традыцыйная»;

шашлык з свініны «Сіньёр Памідор»;

прадукт з свініны арыгінальны мякатны сыравялены «Далікатэс Беларускі»;

прадукт фірмовы мякатны свініна закусачная вэнджана-вараная астуджаная;

пельмені «Смачныя».

Натуральная аплата

Члены калектыву «Зары» атрымліваюць за месяц 11 кілаграмаў свініны плюс 5 кілаграмаў мяса птушкі і 120 штук яек, штодзень два пакеты малака.

Існуе дапамога да адпачынку, выдзяляюцца грошы на бульбу, а таксама да нейкіх падзей, якія здараюцца ў жыцці.

■ Прыемная навіна

КІНАТЭАТРЫ МІНШЧЫНЫ ПЕРАХОДЗЯЦЬ НА ЛІЧБУ

У кінатэатры «Беларусь» горада Слуцка пасля заканчэння рамонту 23 красавіка адкрыецца новая зала для гледачоў. Яна адпавядае самым высокім сучасным тэхналагічным стандартам: вялікі экран, яркая выява ў лічбавым фармаце, аб'ёмны гук, новая схема размяшчэння глядацкіх месцаў павышанай камфартабельнасці. Пры тэхнічным пераабсталяванні кінатэатра выкарыстаны сусветныя тэхналогіі: лічбавы кінапраектар DLP Christer Solaria 2220, лічбавы кінасервер Dolby DSS220, сістэма кінапаказу 3D Master Image.

— Прымяненне тэхнічных навацый адкрывае новыя перспектывы ў развіцці кінатэатра. Гэта дэманстрацыя фільмаў у фармаце 2D і 3D, сусветных прэм'ер, пашыраныя тэрміны іх паказу, што дазволіць гледачам выбіраць зручны час для прагляду. Цяпер у кінатэатра з'явілася магчымасць стварыць максімальнае ўражанне, адчуванне «паглыблення» ў сюжэт фільма, што дапаможа адцягнуць іх увагу ад хатняга тэлеэкрана і прагляду «пірацкага» відэа, — упэўнена намесніца генеральнага дырэктара камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінаблкінавідэапракат» Таццяна Дарашкевіч.

Усяго ў сістэме прадпрыемства 24 кінатэатры. «Беларусь» — пяты кінатэатр і 7 зала на Міншчыне, аснашчаная лічбавым абсталяваннем. Раней рэканструяваны кінатэатры: «Кастрычнік» г. Барысава, «Зорка Венера» г. Салігорска (па 2 залы адпаведна), «Радзіма» г. Маладзечна, «Юнацтва» г. Жодзіна (па 1 зале).

Сёлета яшчэ 4 кінатэатры ўступяць у строй у абноўленым лічбавым фармаце: «Мір» г. Вілейка, «Эра» г. Дзяржынск, «Кастрычнік» г. Мар'іна Горка, «Салют» г. Нясвіж. Такім чынам, у вобласці будуць функцыянаваць 9 кінатэатраў і 11 залаў з найноўшымі лічбавымі тэхналогіямі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■

ПРИГЛАШЕНИЕ НА ПЕРЕГОВОРЫ

Организатор переговоров: УП «СПЕЦТЕХНАЛАДКА», 220005 г. Минск, ул. Платонова, д. 22, оф. 605, р/с 3012134540017 ЗАО Банк ВТБ (Беларусь) г. Минск, ул. Московская, д. 14, БИК 153001108, УНП 190463709, тел. 296 65 58, e-mail: stn-minsk@mail.ru.

Ответственное лицо: главный инженер Нараб Алексей Сергеевич, тел./факс 296 65 64.

Способ проведения переговоров: без предварительного квалификационного отбора участников, с возможностью проведения процедуры снижения цены заказа.

Предмет заказа: выполнение пусконаладочных работ на объекте: «Строительство завода по производству плиты МДФ/ХДФ мощностью 150 тыс. м³/год, ламинированной плиты, ламината для пола в районе станции Ребуса Речицкого района»:

